РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ЛЮТАГА 2025 г. АЎТОРАК № 23 (30411)



# «ПА ЎСІХ КІРУНКАХ БУДЗЕМ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ»

**Рабочы тыдзень у Палацы Незалежнасці распачаўся са спраў інтэграцыйных. З губернатарам далёкага па адлегласці, але блізкага па эканамічных і чалавечых стасунках Хабараўскага краю Прэзідэнт гаварыў не толькі пра канкрэтнае супрацоўніцтва, але і пра тое, што робіць нас мацнейшымі. І зусім невыпадкова, што першы візіт кіраўніка дзяржавы пасля выбараў запланаваны ў Расію.**

(Працяг на 2-й стар.)

# ЧАС ВЯЛІКАЙ БУДОЎЛІ

Адзін з галоўных індыкатараў развіцця краіны — наяўнасць і колькасць у вялікіх і малых паселішчах будаўнічых кранаў. Калі ідзе будаўніцтва — гэта значыць, у краіне клапоцяцца аб людзях. Аб тым, каб у іх было жыллё, каб былі побач з жыллём сацыяльныя аб'екты і аб'екты сэрвісу. Калі ідзе будаўніцтва — значыць, развіваюцца і іншыя галіны эканомікі. Разам з дамамі, школамі, бальніцамі, магазінамі, гандлёвымі цэнтрамі дзяржава будуе свой моцны падмурак, які становіцца важнай апорай незалежнасці і суверэнітэту. У Беларусі будаўнічыя краны відаць паўсюль. У нас — час вялікай будоўлі, час умацавання таго самага падмурка, на якім стаіць краіна. Таму і падтрымка гэтаму — на самым высокім узроўні. І першы пасля выбараў указ кіраўнік дзяржавы падпісаў аб арэндным жыллі, а праз некалькі дзён з'явіўся яшчэ адзін указ Прэзідэнта — ужо аб спрашчэнні працэдур для юрыдычных асоб, якія будуюць больш складаныя аб'екты.

Падрабязнасці аб названых указах — на 5-й стар.



ШТО НОВАГА Ў СПАЖЫВЕЦКІМ КРЭДЫТАВАННІ 6



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

ЗДАРОЎЕ

## КАЛІ ДЫЯГНАЗ — НЕ ПРЫСУД

**Як сучасныя метады дапамагаюць у дыягностыцы і лячэнні раку**

Сучаснае абсталяванне адыгрывае вялізную ролю ў дыягностыцы і лячэнні раку. За апошні час у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава ўдалося істотна яго абнавіць. Адзін з апошніх набыткаў — апарат МРТ магутнасцю 3 Тэсла, якіх у краіне пакуль няшмат, і ён надзвычай важны для нейрахірургіі. Унікальнае абсталяванне — гама-нож, які выкарыстоўваецца для лячэння пухлін рознай лакалізацыі ў галаўным мозгу. Пасля мадэрнізацыі павялічылася яго прапускная здольнасць і пашырыліся паказанні: калі раней на лячэнне такім метадам бралі пацыентаў з невялікімі пухлінамі — да 2-3 см, то цяпер устаноўка здольная апраменьваць пухліны галаўнога мозгу і метастазы любога памеру. Акрамя таго, закуплены новы секвенатар ДНК. У перспектыве ў цэнтры плануюць аперыраваць з дапамогай робатаў. Для малаінвазійных умяшанняў іх змогуць выкарыстоўваць у анкагінекалогіі, анкаўралогіі, анкапракталогіі.



СТАР. 9

# «МЫ АБСАЛЮТНА Ў СТАНЕ ВЫРАШЫЦЬ ТЫЯ ПЫТАННІ, ЯКІЯ ЖЫЦЦЁ ПАСТАВІЛА ПЕРАД НАМІ»

## У якіх кірунках для гэтага трэба працаваць

Новы працоўны тыдзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі пачаўся з перагавораў на перспектыву. Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з губернатарам Хабараўскага краю Дзмітрыем Дзямешыным. Гэтымі днямі дэлегацыя расійскага рэгіёна з візітам у Беларусі. Графік насычаны: наведванне прадпрыемстваў, перагаворы з калегамі з Магілёўскай вобласці, знаёмства з культурнымі славутасцямі Беларусі. Але найперш — сустрэча з кіраўніком дзяржавы, падчас якой былі акрэслены асноўныя вектары супрацоўніцтва.



Фота БелТА.

### ТЭНДЭНЦЫІ РОСТУ ПАВІННЫ ЗАХАВАЦЦА

Вітаючы гасцей, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго частыя сустрэчы з губернатарамі расійскіх рэгіёнаў — гэта добры знак на перспектыву ў плане вырашэння галоўных пытанняў, якія сёння стаяць перад Расіяй і Беларуссю.

**«Жыццё паставіла гэтыя пытанні. І калі б у мяне спыталі, рады я гэтаму ці не, цяжка было б адказаць. Добра, што нарэшце знешнія ўмовы прымусілі нас займацца і сваімі праблемамі ўнутры і менш пазіраць па баках. Я абсалютна перакананы, што, нягледзячы на сур'ёзнасць выклікаў, мы абсалютна ў стане ў цяперашніх умовах вырашыць тыя пытанні, якія жыццё паставіла перад намі», — сказаў ён.**

Прэзідэнт звярнуў увагу, што за 11 месяцаў 2024 года тавараабарот паміж Беларуссю і Хабараўскім краем павялічыўся амаль на 46 %, экспарт склаў 47 мільёнаў долараў, імпарт — менш за мільён. На яго думку, такія тэндэнцыі захаваюцца і па выніках года. Дарэчы, паказчык узаемнага гандлю ў 47,8 мільёна долараў, паказаны ў мінулым годзе, пабіў рэкорд, які трымаўся з 2019 года.

### ПРАДУКЦЫЯ МАШЫНАБУДАВАННЯ

Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на ключавых кірунках супрацоўніцтва Беларусі і Хабараўскага краю. «Мы заўсёды пастаўлялі ў ваш рэгіён велікагрузныя кар'ерныя самазвалы БелАЗ, і мы працягваем рэалізацыю нашай унікальнай тэхнікі ў вашым краі. На постсавецкай прасторы больш ніхто не вырабляе такія машыны. Можа, і не трэба. Мы можам задаволіць попыт на іх не толькі Расійскай Федэрацыі, але і многіх краін свету. Мы — адна з трох сусветных кампаній, якія вырабляюць гэту прадукцыю, і 40 % сусветных паставак — наш БелАЗ. Таму мы гатовы пашыраць пастаўкі, мы гатовы абслугоўваць гэту тэхніку, інакш нельга, яе ніхто не зможа абслугоўваць, акрамя вытворцы. У гэтым плане вы на нас можаце разлічваць», — акрэсліў адзін кірунак Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, улічваючы, што Беларусь перш за ўсё машынабудаўнічая краіна, у Хабараўскі край можа пастаўляцца пасажырскі транспарт.

**«У рамках кластара па зборцы электробусаў, які ствараецца ў вас, гатовы прапанаваць пакетнае рашэнне па пераходзе асобнага населенага пункта або раёна на электратранспарт, уключаючы будаўніцтва зараднай інфраструктуры. Значыць, тое месца, якое вы вызначыце, мы гатовы пад ключ забяспечыць электратэхнікай», — прапанаваў кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь можа пастаўляць у Хабараўскі край спецыяльную тэхніку, тэхніку для розных прамысловых цыклаў. У рамках будаўніцтва БАМ-2 могуць зацікавіць дарожна-будаўнічыя, грузавыя машыны, якія выпускаюцца «Амкадор» і МАЗ. «У нас дастаткова гэтай тэхнікі. Калі ў вас будзе да гэтага цікавасць, мы гатовы такую тэхніку паставіць, яе абслугоўваць і гарантаваць яе эфектыўную работу», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Дарэчы, падчас свайго папярэдняга візіту ў Беларусь у кастрычніку 2024 года дэлегацыя Хабараўскага краю наведвала БелАЗ, МАЗ і «Амкадор». «Бачым перспектывы пастаўкі беларускай пажарнай, аварыйна-ратаваль-







най тэхнікі, машын для абслугоўвання аэрадромаў. Мы пастаўляем гэту тэхніку па ўсім свеце», — працягнуў Прэзідэнт.

### АВІЯБУДАВАННЕ

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, сур'ёзна разглядаецца пытанне кааперацыі ў авіябудаванні. Ён падкрэсліў, што сферай супрацоўніцтва могуць стаць пастаўкі дэталяў і зборачных адзінак, якія выпрацоўваюцца ў Беларусі для хабараўскіх прадпрыемстваў ВПК і грамадзянскага авіябудавання. «Я хацеў бы, каб вы на гэта звярнулі ўвагу. Калі такая неабходнасць будзе, мы абавязкова будзем з вамі працаваць», — сказаў беларускі лідар.

### ЛІФТАБУДАВАННЕ

Яшчэ адзін кірунак для супрацоўніцтва — ліфты. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што савецкія ліфты, якія сумленна адпрацавалі свае тэрміны, маюць патрэбу ў замене. «Наш завод нядрэнна працуе, выпрацоўвае памеры ліфтаў такія ж, як у савецкія часы. Яны дастаткова надзейныя, камфортныя, таму гатовы з вамі таксама працаваць. І Расія для нас — прыярытэт. Мы гатовы выконваць перш за ўсё заказы Расійскай Федэрацыі, потым ужо іншых дзяржаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### ІНФРАСТРУКТУРНЫЯ ПРАЕКТЫ

Паводле слоў Прэзідэнта, беларускія будаўнічыя прадпрыемствы зацікаўлены ў рабоце ў Хабараўскім краі. Сярод найбольш цікавых інфраструктурных праектаў ён назваў Амурскі гідраметалургічны камбінат, горна-абагачальны камбінат, рачны лагістычны хаб на Амуры, на базе Хабараўскага рачнога порта, марскі порт Эльга. «Мы прапануем пастаўкі неабходнага абсталявання. Можна дамовіцца па элементах, што мы можам зрабіць для вас», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### АГРАПРАМЫСЛОВЫ КОМПЛЕКС

Традыцыйны кірунак — аграпрамысловы комплекс, прадукты харчавання.

> **«Уладзівасток, Хабараўскі край — карацей, Далёкі Усход, для нас псіхалагічна з'яўляюцца вельмі важнымі рэгіёнамі, бо я — чалавек савецкі, таму лічу, што гэта не чужыя нам рэгіёны. І мы найперш павінны звярнуць увагу на гэтыя рэгіёны, каб яны не адчувалі нейкую аддаленасць ад цэнтра. Таму мы гатовы ў прыярытэтным парадку разгледзець пытанні пастаўкі харчавання, неабходнага для Хабараўскага краю, і супрацоўніцтва ў галіне аграпрамысловага комплексу», — сказаў кіраўнік дзяржавы.**

Паводле яго слоў, такі вопыт супрацоўніцтва ўжо ёсць з Сахалінам, Прыморскім краем. Беларусь вельмі шмат зрабіла для гэтых рэгіёнаў, у тым ліку і ў перадачы тэхналогій у жывёлагадоўлі. Таму, выкарыстоўваючы гэты вопыт, можна супрацоўнічаць і з Хабараўскім краем.

«Мы ў вашым распараджэнні. Наколькі можам, гатовы працаваць. Закрытых тэм няма. Па ўсіх кірунках будзем з вамі супрацоўнічаць», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

### ДАЛЁКІ УСХОД ПАВІНЕН СТАЦЬ ДАЛЁКІМ ТОЛЬКІ ГЕАГРАФІЧНА

Дзмітрый Дзямешын падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за цёплы прыём і гасціннасць. Ад усіх расіян і ад сябе асабіста ён павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з упэўненай перамогай на выбарах. «Мы бачым, з якім вялікім даверам беларускі народ ставіцца да вас. Мноства вашых прыхільнікаў, людзей, якія з вялікай павагай ставяцца да вас, жывуць і ў нас у Расіі, у тым ліку і на Далёкім Усходзе», — сказаў ён.

Губернатар Хабараўскага краю адзначыў, што высокі ўзровень дружалюбнага супрацоўніцтва паміж Расіяй і Беларуссю дае магчымасць развіваць менавіта міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. «Значны аб'ём тавараабароту засяроджаны якраз у рэгіянальным вымярэнні», — падкрэсліў ён. У рамках гэтага візіту запланаваны перагаворы дэлегацыі Хабараўскага краю са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Анатолем Ісачанкам. Перспектывы супрацоўніцтва кіраўнікі рэгіёнаў абмяркоўвалі ў кастрычніку 2024 года, падчас папярэдняга візіту дэлегацыі Хабараўскага краю.



Дзмітрый Дзямешын адзначыў, што Хабараўскі край, нягледзячы на аддаленасць ад Беларусі, у поўнай меры ўцягнуты ў працэсы міжрэгіянальнай інтэграцыі з беларускімі партнёрамі. Упор — на высокія тэхналогіі. Хабараўскі край — гэта прамысловы цэнтр Далёкага Усходу. Тут будуюць самыя сучасныя самалёты-знішчальнікі СУ-37, і ўсю лінейку знішчальных самалётаў, і вузкафюзеляжныя самалёты. У сувязі з гэтым, адзначыў Дзмітрый Дзямешын, прапановы беларускіх калег выглядаюць вельмі цікавымі. «Нам важна, каб мы не ўпадалі ў залежнасць, як былі ў пэўнай ступені ў залежнасці ад заходніх краін. Мы хочам інтэграваць у расійска-беларускую эканоміку. Для нас відавочна, што гэта трэба рабіць», — сказаў ён.

У размове з журналістамі Дзмітрый Дзямешын распавёў, што адной з тэм размовы з Прэзідэнтам стала стварэнне індустрыяльных паркаў, дзе будзе лакалізавана вытворчасць беларускай тэхнікі, якая традыцыйная для нашай горна-апрацоўчай прамысловасці. Гэта і БелАЗы, МАЗы, гэта і сельгастэхніка, тэхніка для ЖКГ. Журналісты пацікавіліся, колькі часу спатрэбіцца на стварэнне індустрыяльных цэнтраў. «Спатрэбіцца прыблізна год. Бо гэта і сэрвіснае абслугоўванне, і лакалізацыя вытворчасці. Мы разумеем, што цяпер хто хутчэй зможа абслужыць тэхніку, рэанімаваць яе пасля паломкі, той выйграе на рынку. І сёння мы гаворым аб тым, што рынак Далёкага Усходу павінен стаць традыцыйным рынкам для Беларусі», — сказаў ён. У графіку дэлегацыі наведванне такіх прадпрыемстваў, як «Бабруйскаграмаш», «Белшына», Мінскі трактарны завод. Дзмітрый Дзямешын адзначыў, што гэта не экскурсіі на прадпрыемствы, а прадметныя наведванні дзеля таго, каб ацаніць, што з убачанага можна прыцягнуць на Далёкі Усход і што можна прапанаваць беларускім партнёрам.

Дзмітрый Дзямешын адзначыў, што глабальная мэта іх візіту — зрабіць так, каб Далёкі Усход быў для Беларусі далёкім толькі геаграфічна. «Рынак Далёкага Усходу павінен стаць традыцыйным рынкам для Беларусі. Мы з задавальненнем запрашаем вашу дружалюбную дзяржаву да нас на Далёкі Усход для таго, каб ён быў не далёкім, а Усходам Расіі, які блізкі Беларусі і ў духоўным, і ў творчым, і ў турыстычным сэнсе, і, вядома, у індустрыялізацыі нашай прамысловасці», — падкрэсліў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## УРАД ПРАЦЯГНЕ ВЫКОНВАЦЬ АБАВЯЗКІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 лютага падпісаў Указ № 47 «Аб паўнамоцтвах Урада Рэспублікі Беларусь». Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларусі 3 лютага 2025 года ўрад склаў паўнамоцтвы перад нававыбраным Прэзідэнтам. Адпаведную пастанову падпісаў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка.

У мэтах забеспячэння бесперабойнай работы выканаўчай вертыкалі ўлады кіраўнік дзяржавы, кіруючыся п. 7 арт. 84 і ч. 11 арт. 106 Канстытуцыі, сваім указам даручыў прэм'ер-міністру, яго намеснікам, міністрам, старшыням дзяржкамітэтаў і кіраўніку Апарату Савета Міністраў прадоўжыць выкананне абавязкаў да фарміравання новага складу ўрада.

Як і раней, у склад урада па пасадзе ўвайшлі старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю, Нацыянальнага статыстычнага камітэта, Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў.

## РАЗМОВА АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і прэм'ер-міністра Пакістана Шахбаза Шарыфа, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Шахбаз Шарыф павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Лідары краін абмеркавалі пытанні двухбаковых адносін паміж Беларуссю і Пакістанам, перспектывы развіцця супрацоўніцтва.

У час размовы таксама былі абмеркаваны дэталі маючага адбыцца візіту прэм'ер-міністра Пакістана ў Беларусь.

Як паведамляла «Звязда», раней Шахбаз Шарыф накіраваў на адрас Аляксандра Лукашэнкі віншавальнае пасланне з нагоды перамогі на выбарах, у якім выказаў спадзяванні на прадаўжэнне сумеснай работы па далейшым умацаванні сувязяў паміж дзвюма краінамі.

## АКТУАЛЬНЫ ПАРАДАК ДНЯ

### Крутой — аб графіку замежных візітаў Аляксандра Лукашэнкі пасля перамогі на выбарах і падрыхтоўцы да УНС

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый Крутой расказаў аб графіку замежных візітаў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі пасля перамогі на выбарах і пачатку падрыхтоўкі да Паслання беларускаму народу і правядзення пасяджэння Усебеларускага народнага сходу. Адпаведныя заявы былі зроблены ў эфіры навін тэлеканала «Беларусь 1».



— Першы візіт Прэзідэнт ужо сам анансаваў. Гэта, безумоўна, Расійская Федэрацыя, яго перагаворы з Прэзідэнтам Расіі. Магчымы яшчэ шэраг спадарожных мерапрыемстваў. Цяпер мы іх адпрацоўваем. Ну а па графіку астатніх краін, безумоўна, гэта нашы сябры. Цяпер атрымана вялікая колькасць запрашэнняў, якія аналізуюцца нашым Міністэрствам замежных спраў. Зыходзячы з гэтага, мы па меры даклада нашаму лідару будзем выбудоўваць і графік міжнародных візітаў, многіх лідараў мы чакаем і ў нас у Беларусі. Гэта таксама дадатковая адказнасць, таму што, безумоўна, кожны такі візіт патрабуе вельмі сур'ёзнай падрыхтоўкі, — расказаў Дзмітрый Крутой.

Ён падкрэсліў, што міжнародны парадак дня ў Прэзідэнта ў гэтым годзе будзе вельмі актыўны.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта таксама расказаў у эфіры, што Аляксандр Лукашэнка пачаў падрыхтоўку да Паслання беларускаму народу і правядзення пасяджэння Усебеларускага народнага сходу:

— Прэзідэнт пачынае падрыхтоўку да Паслання беларускаму народу, правядзення Усебеларускага народнага сходу. Там ён мае намер акрэсліць контуры праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступныя пяць гадоў у развіццё сваёй перадвыбарнай праграмы. Для таго каб па блоках азнаёміцца з тэмамі і пытаннямі, ён хоча паразмаўляць з адпаведнымі спецыялістамі і правесці тэматычныя мерапрыемствы, — патлумачыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Паводле яго слоў, гэта ў першую чаргу эканамічныя тэмы, наведванне прадпрыемстваў. Адна з найбліжэйшых — тэма мікраэлектронікі.

— Апошнія два гады гэты кірунак развіваўся даволі паспяхова. Былі выдзелены рэсурсы, у тым ліку бюджэтныя. Прэзідэнт проста хоча паслухаць, як рэалізаваны тыя задачы і выкананы даручэнні, якія ён вызначыў, — расказаў Дзмітрый Крутой. — І плюс перспектыва на наступныя пяць гадоў у ўзаемадносінах у тым ліку з Расійскай Федэрацыяй, з Кітайскай Народнай Рэспублікай па гэтай праблематыцы.

**Па матэрыялах БелТА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# КОМПЛЕКСНЫ АНАЛІЗ І ЎВАГА

## Ігар СЕРГЯЕНКА правеў прыём грамадзян

**Пытанні, з якімі людзі звяртаюцца ў дзяржаўныя органы ўлады, традыцыйна шматпланавыя. Адметна, што ў Палату прадстаўнікоў людзі прыходзяць не толькі з уласнай праблемай або калектыўнай скаргай, але ставяць пытанне і больш шырока, уносячы прапановы па ўдасканаленні заканадаўства.**



Фота БелТА.

### ЖЫЛЛЁВАЯ ПРАБЛЕМА

У прыватнасці, мінчанка Ганна Мікалаеўна звярнулася да Старшыні Палаты прадстаўнікоў з нестандартнай жыллёвай сітуацыяй. Жанчына — шматдзетная маці. На працягу дзесяці гадоў разам з мужам і трыма дзецьмі яны жывуць у арэнднай трохпакаёвай кватэры камерцыйнага выкарыстання, якую як маладая сям'я атрымалі ў 2015 годзе. Згодна з заканадаўствам, прыватызаваць арэндную кватэру сям'і не дазваляецца. Па прычыне дастатковасці жылой плошчы іх не ставяць і на чаргу тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

«Са студзеня плата разам з камунальнымі паслугамі складае каля 780 рублёў штомесячна, для нас гэта шмат», — паведаміла жанчына. Яна лічыць, што іх сям'я не адзіная, якая трапіла ў падобную сітуацыю, а таму агучыла прапанову аб унясенні змяненняў у жыллёвае заканадаўства. У прыватнасці, Ганна Мікалаеўна лічыць мэтазгодным даць магчымасць шматдзетным сем'ям набываць ва ўласнасць арэнднае жыллё пасля пражывання ў ім на працягу не менш як дзесяці гадоў. Таксама ў адносінах да такой катэгорыі грамадзян жанчына прапаноўвае прымяняць паніжальны каэфіцыент за карыстанне арэндным жыллём.

Як патлумачыў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Рамашка, чалавек, які пражывае ў арэндным жыллі камерцыйнага выкарыстання, не мае права стаяць на чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Такое жыллё, па яго словах, з'яўляецца альтэрнатывай прыватнаму жыллёваму фонду. Што датычыцца паніжальнага каэфіцыента, намеснік міністра адзначыў, што гэты каэфіцыент распаўсюджваецца на канкрэтныя катэгорыі грамадзян: шматдзетныя сем'і ў гэты пералік не трапляюць.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў праінфармаваў, што прыватызацыя арэнднага жылля па пэўных умовах дазволена толькі ваеннаслужачым. Па яго словах, пытанне, з якім звярнулася грамадзянка, імгненна вырашана быць не можа. «Але гэта тэма комплексна вывучаецца ў цяперашні момант ва ўрадзе», — заўважыў ён і паабяцаў, што да гэтага падключацца і дэпутаты.

### ХТО ВІНАВАТЫ?

Індывідуальны прадпрымальнік з Брэста паскардзіўся на тое, што ён не згодны з рашэннямі Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю і інспекцыяй па падатках і зборах Ленінскага раёна г. Брэста, прынятых у адносінах да яго прадпрымальніцкай дзейнасці. Мужчына ўжо абскардзіў рашэнні гэтых органаў у Эканамічным судзе Брэсцкай вобласці, у іску яму было адмоўлена.

Аляксей Леанідавіч удакладніў, што ёсць розныя погляды дзяржаўных органаў на адну і тую ж сітуацыю. Следчы камітэт вынес рашэнне аб невінаватасці ў сувязі з адсутнасцю саставу злачынства, Дэпартамент фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, па словах мужчыны, лічыць яго вінаватым у парушэнні падатковага заканадаўства.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў супярэчнасцяў у гэтым пытанні не бачыць. «Санкцыі эканамічныя — гэта адно, але падстаў для ўзбуджэння крымінальнай справы ў дадзеным выпадку няма, — удакладніў ён. — Усе вашы матэрыялы будуць разгледжаны аб'ектыўна, а мы са свайго боку бяром на кантроль. Аднак на гэта патрабуецца час».

### ПРОСЬБА АБ КАПРАМОНЦЕ

Мінчанка Іна Леанідаўна папрасіла садзейнічання ў правядзенні капітальнага рамонту дома па вуліцы Кузьмы Чорнага. Яна расказала, што дом быў пабудаваны ў 1955 годзе, апошні капітальны рамонт быў праведзены ў 1979-м. Мінчанка ўдакладніла, што канструкцыя дома прадугледжвае драўляныя перакрыцці, у кватэрах устаноўлены газавыя калонкі.

У намесніка кіраўніка Адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска Любові Буткатінай, якая прысутнічала на прыёме, Ігар Сергяенка ўдакладніў, якія планы па вырашэнні сітуацыі. Яна паведаміла, што па гэтым доме распрацавана праектная дакументацыя. Рэалізацыя праектнага рашэння, па яе словах, запланавана на 2026 год.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на тое, што грамадзянка правільна ставіць пытанне. «Калі даяце слова — трэба трымаць, па-іншаму нельга, — падкрэсліў спікер. — Мы са свайго боку бяром пытанне на кантроль. Падумаем, як паскорыць правядзенне капітальнага рамонту».

**Вераніка КАНЮТА.**

ВЫБАРЫ-2025

# АДКРЫТА, ГАЛОСНА, ЗГОДНА З ЗАКАНАДАЎСТВАМ

## Цэнтрвыбаркам зацвердзіў вынікі прэзідэнцкіх выбараў



Фота БелТА.

**Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь выбраны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, за кандыдатуру якога прагаласавалі 5 136 293 выбаршчыкі, што склала 86,82 % — гэта значыць, больш за палову грамадзян Беларусі, якія прынялі ўдзел у галасаванні.Вынікі выбараў устаноўлены на падставе пратаколаў абласных і Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта аб выніках галасавання па абласцях і Мінску, якія былі прадстаўлены ў Цэнтральную выбарчую камісію.**

Агульная колькасць выбаршчыкаў па краіне склала 6 903 994 чалавекі. Бюлетэні атрымалі 5 916 834 выбаршчыкі. У галасаванні прынялі ўдзел 5 916 195 выбаршчыкаў. Як удакладніла **сакратар Цэнтральнай выбарчай камісіі Алена БАЛДОЎСКАЯ**, датэрмінова прагаласавалі 2 887 052 выбаршчыкі. «Па месцы знаходжання прагаласавалі 278 850 выбаршчыкаў, — дадала яна. — У дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання прынялі ўдзел у галасаванні 2 750 293 выбаршчыкі».

За Алега Гайдукевіча прагаласавалі 119 272 выбаршчыкі, за Ганну Канапацкую — 109 760, за Сяргея Сыранкова — 189 740, за Аляксандра Хіжняка — 102 789. Супраць усіх кандыдатаў прагаласавалі 213 277 выбаршчыкаў.

### ВЫБАРЫ АСВЯТЛЯЛІ 812 ПРАДСТАЎНІКОЎ СМІ

Як падкрэсліў на пасяджэнні ЦВК **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА**, кампанія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праведзена ў тэрміны, устаноўленыя нацыянальным заканадаўствам, на падставе патрабаванняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Выбарчага кодэкса, у поўнай адпаведнасці з прынцыпамі адкрытасці і галоснасці, з удзелам шырокага кола назіральнікаў — як нацыянальных, так і замежных.

«Выбары шырока асвятляліся ў інфармацыйнай прасторы, у тым ліку на афіцыйным сайце, у сацыяльных сетках і месенджарах Цэнтральнай выбарчай камісіі, — удакладніў ён. — Так, толькі ў афіцыйным тэлеграм-канале Цэнтральнай камісіі колькасць праглядаў нашай інфармацыі ў асноўны дзень галасавання перавысіла 1,8 млн, было зафіксавана амаль 9 тысяч рэпостаў».

Ігар Карпенка адзначыў якасную работу Інфармацыйнага цэнтра. «У Інфармацыйным цэнтры было акрэдытавана 812 прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку 331 — з замежных медыя, якія прадстаўляюць краіны Еўропы, Азіі, Лацінскай і Паўночнай Амерыкі, Блізкага Усходу, — удакладніў ён. — Сярод акрэдытаваных — журналісты 70 вядучых сусветных медыя».

У перыяд правядзення кампаніі таксама працаваў інфармацыйна-даведачны цэнтр ЦВК. «Мы аператыўна рэагавалі на запыты выбаршчыкаў, якія паступаюць, прымалі неабходныя меры, накіраваныя на рэалізацыю выбарчых правоў грамадзян, — падкрэсліў старшыня Цэнтрвыбаркама. — Было апрацавана больш за 2200 званкоў. Асноўныя тэмы зваротаў — пошук участка для галасавання, удакладненне звестак аб месцах размяшчэння перадвыбарных праграм кандыдатаў, жаданне галасаваць не па месцы рэгістрацыі. Вялася таксама работа па разглядзе пісьмовых зваротаў грамадзян. З пачатку кампаніі іх паступіла больш за 100. На ўсе звароты па пытаннях кампетэнцыі Цэнтральнай камісіі былі дадзены адказы».

Актыўна выкарыстоўваўся размешчаны на сайце Цэнтрвыбаркама сэрвіс па пошуку ўчастка для галасавання. Гэтай пошукавай сістэмай скарысталася каля 80 тысяч чалавек.

### НАЗІРАЛЬНІКАЎ БЫЛО ШМАТ

За ходам прэзідэнцкай кампаніі ажыццяўлялі назіранне 44 361 нацыянальны, а таксама 486 замежных (міжнародных) назіральнікаў з 52 краін свету, у тым ліку місіі назіральнікаў ад СНД, ШАС, прадстаўнікі дэлегацыі Панафрыканскага парламента, дэлегацыя МЗС КНР, прадстаўнікі 17 цэнтральных выбарчых органаў замежных дзяржаў, а таксама эксперты ў сферы выбарчага права і тэхналогій. «ЦВК Беларусі былі акрэдытаваны прадстаўнікі з 17 краін Еўропы, 15 краін Азіі, 9 краін СНД, 7 краін Афрыкі, з 4 краін амерыканскага кантынента», — канкрэтызаваў Ігар Карпенка.

Для арганізацыі і правядзення выбараў Прэзідэнта былі створаны 153 тэрытарыяльныя камісіі, 5325 участкаў для галасавання, сфарміравана такая ж колькасць участковых камісій. Работу камісій забяспечвалі 58 239 чалавек.

Паколькі ў адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам участкі для галасавання за мяжой не ствараліся, для арганізацыі галасавання грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за мяжой і стаяць на консульскім уліку, было выначана па адным участку ў кожным абласным цэнтры і ў Мінску. У галасаванні, па словах кіраўніка ЦВК, прынялі ўдзел 114 грамадзян названай катэгорыі.

Старшыня ЦВК паведаміў, што ад грамадзян або назіральнікаў скаргі аб парушэннях патрабаванняў выбарчага заканадаўства ў працэсе галасавання або пры падліку галасоў, якія маглі б паўплываць на вынікі выбараў, не паступалі.

Рэзюмуючы, Ігар Карпенка адзначыў, што праведзеныя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь завяршылі электаральны цыкл па фарміраванні органаў дзяржаўнага кіравання на аснове абноўленага канстытуцыйнага заканадаўства. «Наша задача на найбліжэйшую будучыню — абагульніць практыку прымянення выбарчага заканадаўства з улікам меркавання арганізатараў выбараў, выпрацаваць прапановы па ўдасканаленні заканадаўства і выбарчых працэдур, у тым ліку з прымяненнем элементаў лічбавізацыі», — падкрэсліў ён.

**Вераніка КАНЮТА.**

НАВАЦЫІ

# ПАЛЁГКА ДЛЯ БІЗНЕСУ

## Будаўнічыя працэдуры для юрыдычных асоб спрошчаны

**Прэзідэнт Беларусі 31 студзеня падпісаў Указ «Аб асаблівасцях будаўніцтва і прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**



У адпаведнасці з дакументам істотна спрашчаецца будаўніцтва юрыдычнымі асобамі аб'ектаў, якія адносяцца да чацвёртага і пятага класаў складанасці (паводле класіфікацыі, устаноўленай будаўнічымі нормамі Беларусі).

Прыёмка ў эксплуатацыю такіх аб'ектаў, збудаваных па паўторна выкарыстаных праектах ці праектах, якія прайшлі дзяржаўную будаўнічую экспертызу, будзе ажыццяўляцца толькі на падставе заключэння органаў Дзяржбуднагляду без атрымання заключэнняў іншых наглядных органаў. Заказчыкам даецца права будаваць (узводзіць, рэканструяваць, мадэрнізаваць) названыя аб'екты на падставе чарцяжоў, дастатковых для пацвярджэння выканання патрабаванняў бяспекі, і эскізнага праекта, узгодненага падраздзяленнем па архітэктуры мясцовага выканкама.

Склад і аб'ём неабходных чарцяжоў вызначаецца заказчыкам самастойна. Парадак узгаднення эскізнага праекта і яго склад будуць устаноўлены ўрадам. Указам выключаецца неабходнасць атрымання дазвольнай дакументацыі, распрацоўкі перадпраектнай, праектнай дакументацыі і правядзення яе экспертыз (будаўнічай, экалагічнай і іншых).

Асноўнымі ўмовамі прымянення спрошчанага парадку будаўніцтва з'яўляюцца наяўнасць у заказчыка зямельнага ўчастка, дадзенага ва ўстаноўленым парадку, а прызначэнне аб'екта, які будуецца, павінна адпавядаць зацверджанаму генеральнаму плану развіцця тэрыторыі.

У мэтах забеспячэння бяспекі аб'ектаў, якія будуюцца, указам прадугледжаны асаблівы парадак прыёмкі іх у эксплуатацыю з улікам патрабаванняў экалагічнай, пажарнай бяспекі і будаўнічых нормаў.

Нормы ўказа ў частцы спрошчанага парадку прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю ўступаюць у сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання, растлумачылі ў прэс-службе.

**Намеснік прэм'ер-міністра Анатоль СІВАК**, каментуючы прыняты дакумент, заўважыў, што ўказ не тое што спрашчае працэдуру, а адмяняе яе для будынкаў 4-5 класаў складанасці:

— Практычна ўжо не будзе ніякіх працэдур. Адзінае патрабаванне, якое павінен выканаць забудоўшчык, — атрымаць узгадненне ў архітэктуры раённага ўзроўню, якое пакажа, ці можна такі аб'ект у адпаведнасці з генпланам будаваць на ўчастку, які належыць патэнцыяльнаму забудоўшчыку. Гэта значыць, ён (указ. — **Заўв. аўт.**) фактычна адмяняе ўсе працэдуры.

На думку профільнага віцэ-прэм'ера, такое радыкальнае рашэнне павінна спрасціць дзейнасць бізнесу, павысіць яго эфектыўнасць, скараціць тэрміны пачатку будаўніцтва аб'екта:

— Практычна пасля прыняцця рашэння можна пачынаць будаваць, — дадаў ён.

Тлумачачы, якія аб'екты закрануць навацыі, Анатоль Сівак адзначыў, што 5 клас — гэта, напрыклад, гандлёвы пункт, крама да 1000 кв. м:

— Гэта будынкі раённага ўзроўню, любога населенага пункта. У горадзе Мінску таксама такія аб'екты ёсць. Гэта невялікія гандлёвыя цэнтры, крамы да 1000 кв. м або вытворчыя аб'екты да 5000 кв. м. Скажам, на тэрыторыі трактарнага завода неабходна зрабіць цэх памерам 50 на 100 метраў або пяціпавярховы будынак адміністрацыйнай накіраванасці (бізнес-цэнтр). Гэта досыць буйныя аб'екты. Іх можна і новыя будаваць, і рэканструяваць. Таму гэта (рашэнне. — **Заўв. аўт.**) фактычна паскарае эканамічныя працэсы.

Па словах Анатоля Сівака, указ закране прыватны бізнес, дзяржаўныя прадпрыемствы, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, усе галіны:

— Скарыстацца можа любы, няма абмежаванняў. Гэта дае права, яно не абавязвае: вы можаце будаваць у адпаведнасці з дзеючымі працэдурамі.

На яго думку, дзеючыя працэдуры будуць выконвацца тады, калі гаворка ідзе аб фінансаванні будаўніцтва за бюджэтныя сродкі:

— Таму што там важна расходаванне любога рубля, прынцыпе эфектыўных рашэнняў. Хоць гэта не выключае магчымасць досыць простыя тэхнічныя рашэнні рэалізоўваць па такой схеме. Галоўнае, каб персанал забудоўшчыка быў уважлівы і афармленне актаў адпавядала фактычным выдаткам, не было нейкіх адхіленняў. Гэта ўсё магчыма, гэта не вялікая праблема. Будучыя і бюджэтныя аб'екты з паралельным будаўніцтвам, праектаваннем. Ёсць асобнае рашэнне кіраўніка дзяржавы, якое дае права і да цяперашняга часу будаваць аб'екты па такой схеме. Таму гэта ўсіх закране.

Ацэньваючы аб'ём узвядзення аб'ектаў па новай схеме, Анатоль Сівак растлумачыў:

— На маю думку, на сёння можна да 50 % аб'ектаў будаваць па такой схеме. Працэдуры складаліся гадамі, яны прадыктаваны (не сакрэт) перастрахоўкай чыноўнікаў на кожным працоўным месцы, калі кожны крок трэба ўзгадніць. Тут на першым месцы — адказнасць самога бізнесу.

**Маргарыта ЗАРОЎКІНА.**



НА СЛЫХУ

# АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ — НАЙБОЛЬШ ЗАПАТРАБАВАНЫМ РАБОТНІКАМ

**Указам «Аб асаблівасцях прадастаўлення і выкарыстання арэнднага жылля» рэгулюецца выдзяленне такога жылля работнікам найбольш запатрабаваных у краіне прафесій, растлумачылі ў Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

«Пашыраюцца кампетэнцыі мясцовых органаў улады на прыняцце рашэння аб выдзяленні арэнднага жылля, — адзначыла **начальнік аддзела юрыдычнай работы і кадраў МЖКГ Вольга ГЕРМАН.** — Указ пашырае катэгорыі асоб, якія будуць мець права на атрыманне арэнднага жылля пры будаўніцтве і ўзвядзенні шматкватэрных жылых дамоў тыпавых спажывецкіх якасцяў».

### ЯК СКЛАДУЦЬ ПЕРАЛІКІ?

Раённыя і гарадскія выканаўчыя камітэты дакумент надзяляе правам вызначаць на месцах пералік спецыялістаў, у якіх мае патрэбу рэальны сектар і сацыяльная сфера рэгіёна, і прымаць рашэнні аб выдзяленні ім арэнднага жылля на падставе хадайніцтваў работадацўаў з ліку розных органаў і арганізацый.

— Пералік прафесій будзе зацвярджацца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па ўзгадненні з органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкамаў, іншых структурных падраздзяленняў, — падкрэсліла Вольга Герман. — Такім чынам, першае, што спатрэбіцца для рэалізацыі гэтага ўказа, — зацвярджэнне такіх пералікаў.

— Гаворка не ідзе пра засяленне арэнднага жылля, якое вызваляецца: тут дзейнічаюць нормы артыкула 111 Жыллёвага кодэкса, — адзначыла Вольга Герман. — Па агульным правіле, 40 % — для асоб, якія маюць права на першачарговае атрыманне арэнднага жылля ў сувязі з характарам працоўных і службовых адносін. Астатнія 60 % размяркоўваюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ва ўстаноўленым парадку — для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы жыхарства.

Прадугледжваецца магчымасць самастойнага вызначэння долі арэнднага жылля, якое ўзводзіцца для работнікаў запатрабаваных прафесій, сказала Вольга Герман:

— Долю арэнднага фонду, які ўзводзіцца, будуць вызначаць распарадчыкі сродкаў ад здачы ў наём арэнднага жылля — аблвыканкамы і Мінгарвыканкам — на падставе хадайніцтваў гарадскіх і раённых выканкамаў.

**— Адна з умоў атрымання арэнднага жылля — выдзяленне яго на перыяд працоўных адносін з арганізацыямі, — патлумачыла Вольга Герман. — Пры гэтым мы гаворым не толькі аб дзяржаўных арганізацыях. Арганізацыі могуць быць любых формаў уласнасці. Любыя з іх змогуць выдаваць хадайніцтвы сваім работнікам.**

У першачарговым парадку арэндным фондам будуць забяспечвацца работнікі, якія не маюць ва ўласнасці і ў карыстанні іншага жылля па месцы работы ў адпаведным населеным пункце. Калі чалавек спыняе працоўныя адносіны з арганізацыяй, арэнднае жыллё, якое вызвалілася, будзе размяркоўвацца сярод іншых работнікаў, дадала спікер. Калі складзецца сітуацыя, пры якой усе запатрабаваныя спецыялісты будуць забяспечаны арэндным жыллём, прызначанае для іх жыллё можна будзе размяркоўваць у адпаведнасці з агульнымі падыходамі, прадугледжанымі Жыллёвым кодэксам: 40 % — першачаргавікам, 60 % — тым, хто знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу.

### З УЛІКАМ ПАНІЖАЛЬНАГА КАЭФІЦЫЕНТА

Аплата за карыстанне арэндным жыллём прадстаўнікам найбольш запатрабаваных прафесій, якія маюць першачарговае права на яго атрыманне, будзе разлічвацца з улікам паніжальнага каэфіцыента.

— Гэта значна зніжае памер платы за карыстанне арэндным жыллём, якое даецца ў сувязі з характарам працоўных і службовых адносін, і ўраўноўвае работнікаў найбольш запатрабаваных прафесій з катэгорыямі грамадзян, якія маюць права на першачарговае выдзяленне арэнднага жылля ў адпаведнасці з Жыллёвым кодэксам, — адзначыла Вольга Герман.

Указ вызначае не толькі прадастаўленне, але і выкарыстанне арэнднага жылля, дадала спецыяліст. У прыватнасці, гаворка ідзе пра магчымасць вызвалення ад платы за карыстанне арэндным жыллём на пэўны перыяд пры ўмове, што наймальнік робіць рамонт за ўласныя сродкі.

Акрамя таго, падкрэсліла Вольга Герман, практыка паказвае, што дзяржава — надзейны арэндадавец і людзі гэта цэняць:

— Першы раз дагавор заключаецца на тэрмін да пяці гадоў і пасля падаўжаецца неабмежаваную колькасць разоў. Гэта не прыватны фонд, калі ўласнік жылога памяшкання можа папярэдзіць жыхара аб неабходнасці з'ехаць на працягу месяца.

**Аляксандра Анцэлевіч.**

## «О реализации имущества ООО «ГАРАНТ КАЧЕСТВА»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290 |
| **Продавец** | ООО «ГАРАНТ КАЧЕСТВА», УНП 190530832 |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Повторные торги в форме открытого аукциона **20.02.2025 в 11.00,** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, оф. 911 |

**Сведения о предмете проведения торгов**

Лот № 1 – стройматериалы (109 наименований).

Лот № 2 – строительное оборудование (142 наименования).
Перечень имущества размещен на сайте организатора (https://likvid.by/).

По вопросу ознакомления с предметом торгов, дополнительной информации обращаться по тел. +375 (29) 6244330, +375 (44) 7945248,

**Начальная цена предмета торгов:**
Лот № 1: **48 832,43** руб. с НДС; Лот № 2: **33 106,47** руб. с НДС.

**Порядок проведения торгов**

Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**Размер задатка, сроки приема заявок и порядок зачисления задатка**

Задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов перечисляется по лоту в срок по **19.02.2025** на р/с BY78BPSB30121732950169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, код BPSBBY2X, получатель – ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в торгах. Прием заявок с приложением документов осуществляется заказной корреспонденцией в адрес ООО «ЛиквидБай» (220079, г. Минск, а/я 256) либо по e-mail: info@likvid.by до 15.00 19.02.2025.

| | |
|---|---|
| **Возмещение затрат** | Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня проведения. |
| **Док-ты, необходимые для участия в торгах** | Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах. |



**Организатор торгов (ликвидатор Совместного общества с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс») объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества в форме аукциона.**

| | |
|---|---|
| Продавец: | Совместное общество с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс» |
| Место проведения торгов: | г. Минск, ул. Лещинского, дом 12, комн. 9 |
| Дата и время проведения торгов: | 19.02.2025 г. в 12.00 |
| Срок подачи заявок: | не позднее 14.02.2025 г. до 17.00. |
| Ранее опубликованные извещения о проведении торгов | газета «Звязда» от 02.12.2023 № 234 (30114), от 14.02.2024 № 31 (30165), от 13.04.2024 № 74 (30208), от 18.09.2024 № 182 (30316), от 29.11.2024 № 233 (30367) |

**Предмет торгов и начальная цена**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, руб., без НДС |
|---|---|---|
| 1. | Капитальное строение с инв. № 500/С-43932, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12, общей площадью 1204,5 кв. м, наименование: главный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 3 025 000 |
| 2. | Капитальное строение с инв. № 500/С-43933, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/1, общей площадью 721,9 кв. м, наименование: помещение мойки, кафе, административные помещения, назначение: здание многофункциональное, расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 1 650 000 |
| 3. | Капитальное строение с инв. № 500/С-43836, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/2, общей площадью 538,4 кв. м, наименование: вспомогательный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 1 130 000 |

| | |
|---|---|
| Обременения: | В отношении всех лотов – ипотека, аренда. |
| Порядок подачи заявок: | Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются по месту проведения торгов либо направляются по адресу: 220052, г. Минск, а\я 17 (получатель – ликвидатор СООО «Петрофф Плюс» ИП Ржеутский А.В.), со дня выхода настоящего извещения. |
| Задаток: | Задаток в размере десяти процентов от начальной цены лота перечисляется на р/с BY90 PJCB 3012 0763 3310 0000 0933 в «Приорбанк» ОАО, г. Минск, БИК PJCBBY2X, получатель – СООО «Петрофф Плюс»», УНП 190861019. |
| Условия аукциона: | Шаг аукциона: пять процентов. При признании торгов несостоявшимися, в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, и он согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, а также победитель аукциона – претендент на покупку должен заключить с продавцом договор купли-продажи в течение двух рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.<br>Оплата стоимости предмета торгов осуществляется в течение пяти банковских дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не определено договором купли-продажи. Возмещение затрат, связанных с организацией и проведением торгов осуществляется участником, выигравшим торги, в течение пяти банковских дней со дня проведения торгов.<br>Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты их проведения.<br>Порядок проведения аукциона установлен Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. |

С дополнительной информацией можно ознакомится по тел. +375 29 667 16 72




ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПРАЗРЫСТАСЦЬ І ЛАГІЧНАСЦЬ У АСНОВЕ

## Што прадугледжваюць навацыі спажывецкага крэдытавання?

Днямі члены Савета Рэспублікі адобрылі палажэнні законапраекта «Аб спажывецкім крэдыце і спажывецкай мікрапазыцы», які перад гэтым дэталёва быў разгледжаны членамі Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах падчас выязнога пасяджэння на базе «Беларусбанка». Асноўная мэтавая задача, якую парламентарыі сумесна з рэгулятарам вырашалі, працуючы над дакументам, — павышэнне ўзроўню абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг. Падрабязнасці навацый даведаліся ў старшыні профільнай камісіі Савета Рэспублікі Уладзіслава ТАТАРЫНОВІЧА.



### БУМ НА СПАЖЫВЕЦКІЯ КРЭДЫТЫ

— Асаблівасць беларускага заканадаўства ў сферы спажывецкага крэдытавання заключаецца ў тым, што на сёння няма адзінага нарматыўнага прававога акта, якім бы рэгуляваласа дадная сфера адносін, у тым ліку аперацыі мікрафінансавання, — растлумачыў суразмоўца. — Частка нормаў замацаваная ў банкаўскім, грамадзянскім кодэксах, асобных указах кіраўніка дзяржавы, лакальных актах Нацбанка.

Прапанаваны распрацоўшчыкамі законапраект аб'ядноўвае адпаведныя нормы і падпарадкоўвае іх адзінай логіцы — дадатковай абароне грамадзян, якім прадастаўляюцца спажывецкія крэдыты і мікрапазыкі. Не сакрэт, што цяпер адзначаецца бум спажывецкага крэдытавання ў краіне. Толькі за мінулы год прырост спажывецкіх крэдытаў склаў амаль 46 %.



— Закон запатрабаваны і актуальны, — перакананы Уладзіслаў Татарыновіч. — На канец 2024 года агульны аб'ём выдадзеных спажывецкіх крэдытаў склаў крыху больш за 10 мільярдаў рублёў. Гэта звязана з тым, што гэты кірунак банкаўскай дзейнасці запатрабаваны і банкамі (спажывецкім крэдытаваннем займаецца звыш 20 камерцыйных банкаў, каля 79 мікрафінансавых арганізацый працуе з мікрафінансавымі пазыкамі), і нашымі грамадзянамі. Паколькі ў краіне стабільная коштавая сітуацыя, агульная сітуацыя ў эканоміцы стабільная. Растуць заработная плата, іншыя даходы, якія даюць магчымасць працаваць з банкамі і скарыстацца магчымасцю атрымання спажывецкага крэдыту.

Таксама Нацыянальным банкам зацверджаны асноўныя кірункі грашова-крэдытнай палітыкі на 2025 год, дзе прадугледжваецца далейшы рост спажывецкага крэдытавання. Рэгулятар ацэньвае, што ўвогуле за год такім чынам будзе выдадзена каля 14-15 мільярдаў рублёў.

— Гэтаму будуць спрыяць агульная эканамічная сітуацыя, рэальна наяўныя даходы і, што немалаважна, прывабныя стаўкі па крэдытах. Рэгулятар ацэньвае, што на працягу года сярэдняя стаўка будзе складаць каля 10 % пры стаўцы рэфінансавання ў 9,5 %. Таму гэта таксама сведчанне фінансавай стабільнасці, — падкрэсліў сенатар.

Ён выказаў упэўненасць, што нормы законапраекта будуць рэгуляваць усе пытанні, звязаныя з заключэннем, выкананнем дагавораў як спажывецкага крэдытавання, так і мікрапазык.

### МІКРАПАЗЫКІ І ПРЫ ЧЫМ ТУТ АПЕРАТАРЫ СОТАВАЙ СУВЯЗІ?

Адказваючы на пытанне, што павінны скарэктаваць навацыі, Уладзіслаў Татарыновіч растлумачыў:

— Я вылучыў бы тры асноўныя моманты. Першае — стварэнне максімальна празрыстых камфортных умоў для крэдытаатрымальнікаў. Акрамя, скажам, магчымасці прыйсці ў банк і заключыць дагавор спажывецкага крэдыту, ёсць інструменты дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання. У законапраекце гэтыя нормы развіваюцца.

Ён канкрэтызаваў: банк зможа прыцягваць па дагаворы трэція асобы, якія будуць аказваць адпаведныя паслугі фізічным асобам з пункту гледжання магчымасці атрымання спажывецкага крэдыту:

— Гэта значыць праінфармаваць аб магчымасці такога крэдытавання, аб яго ўмовах дыстанцыйна, не заходзячы ва ўстанову банка, заключыць адпаведны дагавор і потым адпаведным чынам яго выконваць. Гэта значыць пашыраецца кола, з якім фізічная асоба зможа працаваць.

Што датычыцца спажывецкіх мікрапазык, тут таксама, акрамя мікрафінансавых арганізацый, якія выдаюць мікрапазыкі пад заклад рухомай маёмасці, прадугледжваецца магчымасць для спецыялізаваных арганізацый.

— Нацыянальны банк у якасці такіх спецыялізаваных арганізацый разглядае аператараў сотавай сувязі. Досыць вялікія плацяжы праходзяць у рамках аплаты паслуг мабільнай сувязі і ўсім, што з гэтым звязана. Таму, маючы доступ і да крэдытных гісторый, яны маглі б узяць на сябе такую функцыю, — адзначыў суразмоўца.

### НІЯКАЙ ПЕНІ ЗА ДАТЭРМІНОВАЕ ПАГАШЭННЕ

Наступны момант, на які ён звярнуў увагу, — максімальная празрыстасць:

— Пры заключэнні дагавораў спажывецкага крэдытавання, спажывецкіх мікрапазык да іх заключэння патэнцыйнаму крэдытаатрымальніку будзе прадстаўлена максімальна падрабязная інфармацыя, якія паслугі з'яўляюцца дадатковымі, ці неабходна за гэта рабіць аплату. Уводзіцца прынцып: усе дадатковыя паслугі не павінны ніякім чынам уплываць на суму непасрэдна самога крэдыту, таму на практыцы гэтыя пытанні ўзнікалі.

Уладзіслаў Татарыновіч звярнуў увагу на яшчэ адзін немалаважны аспект:

— Уводзіцца ўмова, што нельга адмовіць крэдытаатрымальніку ў датэрміновым пагашэнні крэдыту: ніякая пеня, іншыя плацяжы за гэта спаганяцца не будуць. Таму празрыстасць — дадатковая абарона спажыўцоў гэтага віду фінансавых паслуг.

З'яўляюцца і адпаведныя абавязацельствы:

— Але яны пойдуць на карысць, — перакананы Уладзіслаў Татарыновіч і вось чаму. — Таму што па праекце закона ўводзіцца панятце «ліміт пазыковай нагрузкі». Гэта ідзе ад жыцця. Паколькі часам, пераацаніўшы свае магчымасці, трапляеш у пэўныя ўмовы, і дадатковыя фінансавыя выдаткі могуць быць дастаткова істотнымі.

Уводзяцца і абмежаванні на ўстаноўленне працэнтаў па дагаворы спажывецкай мікрапазыкі. У прыватнасці, не больш за суму мікрапазыкі пры тэрміне вяртання да аднаго года і двухразовай сумы мікрапазыкі — звыш года.

У цэлым у мінулым годзе 96 % усіх мікракрэдытаў выдавалася на тэрмін менш за адзін месяц.

Таксама важнай навацыяй з'яўляецца і магчымасць прадастаўлення грамадзянам, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, адтэрміноўкі плацяжу па дагаворы на тэрмін не менш за тры месяцы.

### Кампетэнтна

***Віктар АНАНІЧ, старшыня праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк», намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:***

— Перш за ўсё, я хацеў бы адзначыць, што законапраект накіраваны на падтрымку людзей, якія атрымліваюць крэдыты, каб абараніць іх ад няслушнай інфармацыі, даць магчымасці банкам, мікрафінансавым арганізацыям па тэрмінах разглядаць пытанні.

Адказваючы на пытанне, якія крэдыты больш за ўсё ў структуры Беларусбанка карыстаюцца попытам у насельніцтва, ён растлумачыў:

— Безумоўна, вялікую долю займае крэдытаванне жылля. І Беларусбанк мае долю (калі казаць аб рынку Рэспублікі Беларусь) больш за 70 %, таму што гэта трэба кожнаму. Далей мы разглядаем крэдыты на спажывецкія патрэбы. Вялікую папулярнасць атрымаў крэдыт «на родныя тавары», якім у мінулым годзе вельмі актыўна карысталіся. Мы выдалі больш за паўмільярда (рублёў. — **Заўв. аўт.**) крэдытаў насельніцтву. Тым самым гэтыя грошы пайшлі ў нашу эканоміку. Гэта значыць, праз спажывецкае крэдытаванне насельніцтва мы падтрымалі і эканамічны блок краіны. Акрамя таго, ёсць шэраг крэдытаў на навучанне, ЭКА, газіфікацыю і іншыя.



ТЭНДЭНЦЫІ

# СКЛАДНІКІ ФІНАНСАВАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

**У Нацбанку падвялі вынікі і акрэслілі перспектывы**

У мінулым годзе былі сфарміраваны манетарныя ўмовы, якія неабходныя для ўстойлівага эканамічнага развіцця краіны. Такую тэндэнцыю адзначылі падчас пашыранага пасяджэння праўлення Нацбанка. Пры гэтым пры правядзенні грашова-крэдытнай палітыкі выконваўся разумны баланс паміж забеспячэннем цэнавай стабільнасці і падтрымкай эканамічнай актыўнасці.

## РУБЛЁВЫ РЭСУРС

Узгодненыя дзеянні Нацбанка і ўрада забяспечылі выкананне мэтавага параметра па інфляцыі. «На працягу ўсяго мінулага года інтэнсіўнасць цэнавай дынамікі заставалася ўмеранай, знаходзячыся, як правіла, ніжэй мэтавага арыенціра ў 6 %, — адзначыў **першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргей КАЛЕЧЫЦ.** — Па выніках мінулага года спажывецкія цэны выраслі на 5,2 %, тады як у 2023-м — на 5,8 %».

Для абмежавання інтэнсіўнасці інфляцыйных працэсаў Нацбанк ажыццяўляў кантроль за дынамікай грашовай прапановы. Каб надаць імпульс працэсам дэвалютызацыі эканомікі, былі павялічаны на 4 працэнтныя пункты нарматывы адлічэнняў у фонд абавязковых рэзерваў ад прыцягнутых сродкаў у замежнай валюце. Цяпер ён складае 20 %, па рублёвых сродках — 4 %.

> **Пры спрыяльным развіцці сітуацыі стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка ў сярэднім за 2025 год можа скласціся на ўзроўні 9—9,3 % гадавых. Адпаведна, гэта пацягне за сабой пэўнае паляпшэнне цэнавых умоў па крэдытах банкаў.**

Як падкрэсліў Сяргей Калечыц, практычна ўсё павелічэнне грашовай прапановы забяспечана яе рублёвым складнікам: «Як вынік — доля рублёвай часткі ў сярэдняй шырокай грашовай масе летась у снежні дасягнула 60 %. Для параўнання: 10 гадоў таму, у снежні 2014-га, сітуацыя была супрацьлеглай: доля замежнай валюты складала тыя ж 60 %. Такім чынам, сістэмная работа Нацбанка і ўрада па павышэнні даверу да нацыянальнай валюты дае адчувальныя вынікі. Беларускі рубель паслядоўна нарошчвае свой функцыянал». Неабходна захаваць гэты станоўчы трэнд. Як адзначыў Сяргей Калечыц, пры крэдытаванні эканомікі перавага павінна аддавацца нацыянальнай валюце.

## ШЫРОКАЯ ЛІНЕЙКА

> **Агульны аб'ём выдачы банкамі крэдытаў насельніцтву і суб'ектам гаспадарання ў нацыянальнай і замежнай валютах летась склаў 185,6 млрд рублёў.**

Попыт з боку эканамічных суб'ектаў прад'яўляўся ў асноўным на рублёвыя крэдыты. Усяго летась прадпрыемствам і насельніцтву банкі іх выдалі на суму 150,7 млрд рублёў, у тым ліку доўгатэрміновых — 34,2 млрд рублёў.

Крэдытаванне рэальнага сектара эканомікі ў беларускіх рублях на працягу мінулага года павялічылася на 24,1 %. Найбольш запатрабаваным фінансавым інструментам з'яўляліся доўгатэрміновыя крэдыты. Іх выдача прырасла за год на 51 %. Актыўна ажыццяўлялася крэдытаванне прадпрыемстваў-экспарцёраў.

Разам з фінансаваннем рэальнага сектара эканомікі актыўна пашыралася і крэдытаванне насельніцтва, асабліва на спажывецкія мэты.

Попыт фізічных асоб задавальняецца банкамі за кошт шырокай лінейкі ўніверсальных прадуктаў і праграм, якія забяспечваюць даступнасць і аператыўнасць разлікаў за кошт крэдытных сродкаў, уключаючы набыццё тавараў айчынных вытворцаў. Цяпер банкі прапаноўваюць звыш 30 такіх крэдытных прадуктаў.

> **Важным кірункам фінансавання насельніцтва заставаліся крэдыты на нерухомасць. За мінулы год банкі выдалі іх на суму 3,9 млрд рублёў, што на 43,8 % больш, чым у 2023-м.**

Пры гэтым дэпазіты насельніцтва ў нацыянальнай валюце прырасլі за мінулы год больш як на трэць. «Важна адзначыць, што ў нашых грамадзян захоўваецца ўстойлівая цікавасць да рублёвых зберажэнняў на працяглыя тэрміны, — заўважыў першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка. — Летась уклады фізічных асоб у нацыянальнай валюце тэрмінам на адзін год і больш павялічыліся на 37,4 %, што істотна вышэй за прагнозны паказчык у 20—24 %».

## КРЭДЫТЫ СТАНУЦЬ БОЛЬШ ДАСТУПНЫЯ

Працэнтная палітыка была накіравана на падтрыманне станоўчага ўзроўню працэнтных ставак на крэдытным і дэпазітным рынках. Як адзначыў Сяргей Калечыц, пры гэтым патрабавалася, з аднаго боку, захаваць прывабныя ўмовы для ажыццяўлення зберажэнняў, а з другога — забяспечыць цэнавую даступнасць пазыковых сродкаў. У сувязі з гэтым стаўка рэфінансавання на працягу ўсяго года заставалася нязменнай на ўзроўні 9,5 % гадавых, што адпавядала верхняй мяжы прагнозных значэнняў.

Сёлета пры адсутнасці рызык для цэнавай і фінансавай стабільнасці чакаецца паступовае зніжэнне працэнтных ставак у эканоміцы.

«Пры спрыяльным развіцці сітуацыі стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка ў сярэднім за 2025 год можа скласціся на ўзроўні 9—9,3 % гадавых. Адпаведна, гэта пацягне за сабой пэўнае паляпшэнне цэнавых умоў па крэдытах банкаў, — заявіў Сяргей Калечыц. — Сярэдняя працэнтная стаўка па новых рынкавых крэдытах банкаў фізічным асобам у нацыянальнай валюце прагназуецца на ўзроўні 9—10,25 % гадавых».

У цэлым з улікам ільготнага крэдытавання сярэдняя працэнтная стаўка па новых рублёвых крэдытах юрыдычным асобам можа скласці 8,5—9,8 % гадавых. «Аднак, як і летась, такая дынаміка працэнтных ставак па крэдытах шмат у чым будзе вызначацца сітуацыяй на дэпазітным рынку», — адзначыў першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка.

## ЗА КОШТ УНУТРАНАГА ПОПЫТУ

Высокая эканамічная актыўнасць забяспечвалася за кошт унутранага попыту, падкрэсліў **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ:** «Гэтаму садзейнічалі рост зарплат, даступнасць крэдытавання і фінансавая падтрымка з боку дзяржавы. Таксама дастаткова актыўна павялічваліся і інвестыцыі ў асноўны капітал. Банкаўскія крэдыты на гэтыя мэты выраслі амаль на 40 %. У мінулым годзе ў няпростых умовах фінансавая стабільнасць была забяспечана. Фінансавы і плацежны рынкі функцыянавалі бесперабойна».

Толькі ва ўмовах устойлівай фінансавай сістэмы прадпрыемствы, насельніцтва, органы дзяржаўнага кіравання могуць у максімальнай ступені рэалізаваць свае планы ў сферы фінансаў, умацоўваючы тым самым эканоміку краіны. «Летась эканоміка краіны працягвала праяўляць гнуткасць у знешнеэканамічнай дзейнасці, асвойваючы новыя гандлёвыя рынкі і падтрымліваючы стабільныя гандлёвыя адносіны з ключавымі партнёрамі, — падкрэсліў намеснік старшыні праўлення Нацбанка. — Знешнегандлёвы абарот павялічыўся на 5,2 %. Унутраныя макраэканамічныя ўмовы ў цэлым спрыялі стабільнаму функцыянаванню эканомікі. Захоўваліся высокія аднаўленчыя тэмпы росту ВУП».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**


**ЗАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест №7»,**

место нахождения: г. Минск, ул. Аранская, 13, каб. 15, – извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 27 марта 2025 г. годового общего собрания.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1) Об итогах работы Общества в 2024 году и основных направлениях развития на 2025 год.

2) Отчет совета директоров и ревизионной комиссии о работе в 2024 году.

3) Утверждение годового бухгалтерского баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2024 год. О дивидендах за 2024 год.

4) О направлениях использования прибыли Общества в 2025 году.

5) Выборы членов совета директоров и ревизионной комиссии.

**Место проведения собрания: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, каб. 316.**

**Начало работы собрания в 11:00.**

Регистрация участников собрания с 10:00 до 10:50 в день проведения собрания по месту его проведения. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 1 марта 2025 г.

Орган, созывающий собрание: совет директоров Общества, основание созыва: протокол от 30.01.2025 г. № 30-01/2025.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14:00 до 17:00 часов, начиная с 27.02.2025 г., по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, каб. 316.

УНП 100088916 Совет директоров ЗАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест №7»



Информация об объявленных торгах и предмете торгов

**Организатор электронных торгов:** комитет «Минскоблимущество», тел.: (8017) 5004710, 5004711, 5168054, 5168055.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by.
**Дата проведения повторных электронных торгов: 28 февраля 2025 г.**

**Лот № 1. Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 630/С-49069) – одноэтажное **здание начальной школы,** общ. пл. 79,8 кв. м, 1960 г. п. (принадлежности: сарай), расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский район, Лебедевский с/с, д. Мороськи, ул. Центральная, 60А. **Начальная цена предмета электронных торгов: 5 640,00 руб.** *(Начальная цена понижена на 80 %.)* **Продавец:** Лебедевский сельский исполнительный комитет.

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by**, Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by**.

УНП 600027538



ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие **«Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона), по поручению **ОАО «Веста-Борисов»** (арендодатель), проводит открытый аукцион по продаже права заключения

**договора аренды части капитального строения (помещения) пл. 81,0 кв. м,** расположенного в **здании магазина № 20 (инв. № 610/С-1278, общ. пл. 1049,1 кв. м)**, по адресу: **Минская область, г. Борисов, ул. Галицкого, 21**, для организации пункта выдачи заказов, организации общественного питания, осуществления розничной торговли непродовольственными товарами.

Срок заключения договора аренды – **3 года.**

Размер ежемесячной арендной платы – **60,75 базовой арендной величины*** *(без учета коэффициента для отдельных видов деятельности)*.

*Базовая арендная величина составляет 17,76 бел. руб., размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

*Коэффициент спроса – 3.*

**Начальная цена предмета торгов – 359,64 бел. руб.**

**Задаток – 359,64 бел. руб. Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение), а также иными актами законодательства.

Штраф в размере **4 200,00 бел. руб.** оплачивается участниками аукциона в следующих случаях:

победителем (единственным участником) аукциона в случае отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора аренды, внесения платы за право заключения договора аренды;

участниками аукциона, отказавшимися объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным в соответствии с частью второй пункта 26 Положения.

победителем в случае отказа от подписания протокола о результатах аукциона.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 14.11.2024 г.

Аукцион состоится **19.02.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с даты опубликования извещения по **18.02.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Телефон для осмотра: (8029) 680-30-51, сайт в сети интернет: www.rlt.by.**

УНН 600012029

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

**Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ:**

# «У СУСЕДНІХ КРАІНАХ ЦУДОЎНА БАЧАЦЬ, ШТО З БОКУ БЕЛАРУСІ Ў АДНОСІНАХ ДА ІХ НЕ ЗЫХОДЗІЦЬ НІЯКІХ ПАГРОЗ»

Як вядома, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка неаднаразова заяўляў, што наша краіна заўсёды прытрымліваецца міралюбівай палітыкі, маючы на ўвазе прыярытэт развіцця ўласнай сістэмы бяспекі і ваеннага супрацоўніцтва з дружалюбнымі краінамі. Беларуская армія ніколі нікому не пагражала, не пагражае і пагражаць не збіраецца. Яна з'яўляецца інструментам недапушчэння вайны, а ў выпадку агрэсіі павінна быць здольная не толькі яе адбіць, але і нанесці непрымальную шкоду праціўніку. Гэта ж датычыцца і ўсяго сілавога блока. Зусім нядаўна, напрыклад, Прэзідэнтам зацверджана рашэнне на ахову дзяржаўнай граніцы ў 2025 годзе.

Гэтыя і іншыя дзеянні кіраўніцтва краіны маюць свой станоўчы эфект. У прыватнасці, як заявіў у эфіры тэлеканала Беларусь 1 **Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ,** на гэты момант няма прыкмет развязвання агрэсіі ў адносінах да Беларусі.



Людзі ў пагонах сваю задачу па забеспячэнні бяспекі электаральнай кампаніі, непасрэдна выбараў выканалі. Але гэта прыватная задача. Перад намі стаіць больш шырокая задача — гарантаваць у цэлым бяспеку нашай краіны. Таму мы працягваем вырашаць комплексна гэтыя задачы», — адзначыў дзяржсакратар Савета бяспекі.

Адказваючы на пытанне аб верагоднасці эскалацыі абстаноўкі, Аляксандр Вальфовіч сказаў: «Выключаць яе нельга. На сёння, прынамсі, мы не бачым тых прыкмет, якія б пагражалі і гаварылі аб развязванні нейкай патэнцыяльнай агрэсіі ў адносінах да Рэспублікі Беларусь. Але колькасць вучэнняў і тыя крокі, якія робіць кааліцыя заходніх краін, вядома, яны не супакойваюць».

Аляксандр Вальфовіч у прыватнасці згадаў аб рашэннях камітэта начальнікаў штабоў, на якім было прынята рашэнне аб значным павелічэнні ваенных бюджэтаў шэрагу краін, у тым ліку найбліжэйшых суседзяў Беларусі — Польшчы і краін Балтыі. «Гэта значыць, што расходы, якія будуць патрачаны Польшчай, Літвой, Латвіяй на ваенныя патрэбы, зашкальваюць звыш разумных лічбаў. У гэтым няма ніякай абсалютна неабходнасці», — падкрэсліў дзяржаўны сакратар Савета бяспекі.

Ён дадаў, што ў суседніх краінах цудоўна бачаць, што з боку Беларусі ў адносінах да іх не зыходзіць ніякіх пагроз, у тым ліку ваенных.



У сваю чаргу **начальнік упраўлення тэрытарыяльнай абароны — намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі Андрэй КРАЎЧАНКА** адзначыў, што і тэрытарыяльная абарона, па сутнасці рэзерв Узброеных Сіл, выконвае дадатковыя і дзесьці нават асноўныя задачы ў гэтым плане. На прыкладзе ўсіх лакальных канфліктаў, вопыце спецыяльнай ваеннай аперацыі, сказаў ён тэлеканалу СТВ, мы бачым, што пытанні тэрытарыяльнай абароны — ключавы момант. У тэрытарыяльнай абароны задач шмат. «Гэта ахова і абарона аб'ектаў, барацьба з адпаведнымі сіламі. Але разам з тым мы разумеем, што недзе ў пэўных момантах мы будзем выконваць задачы сумесна з Узброенымі Сіламі па адбіцці магчымых фактараў агрэсіі», — дадаў начальнік упраўлення.

Ваенная адукацыя

# АД ГЕАДЭЗІІ І ТАПАГРАФІІ — ДА ПРАГРАМАВАННЯ

## Як ваенны факультэт БДУ рыхтуе прафесіяналаў у сферы геаінфармацыйных сістэм

Ваенны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па праве лічыцца флагманам у сістэме ваеннай адукацыі нашай краіны. Тут ажыццяўляецца падрыхтоўка ваенных спецыялістаў у інтарэсах забеспячэння нацыянальнай бяспекі дзяржавы. З яго сцен выпускаюцца высокакваліфікаваныя і ўнікальныя спецыялісты для беларускай арміі, іншых сілавых ведамстваў нашай краіны. Адной з самых запатрабаваных на факультэце лічыцца спецыяльнасць «Геаінфармацыйныя сістэмы ваеннага прызначэння».



Сёння ГІС-тэхналогіі прымяняюцца не толькі ў вырашэнні задач картаграфіі, геадэзіі, землеўпарадкавання і інжынерных работ. Яны сталі неад'емнай часткай нашага паўсядзённага жыцця. Усе мы карыстаемся рознымі картаграфічнымі сэрвісамі: дзякуючы спецыяльнаму дадатку выклікаем таксі, выкарыстоўваем анлайн-карты і гэтак далей.

Велізарнае значэнне ГІС-тэхналогіі маюць і для Узброеных Сіл. Актыўнае ўкараненне іх у аператыўную і баявую падрыхтоўку дазволіла значна скараціць прымяненне аналагавых тапаграфічных карт. А больш шырокае ўкараненне сродкаў аўтаматызацыі дазволіць калі і не адмовіцца ад іх зусім, то вельмі звузіць іх выкарыстанне. Сярод асноўных задач — стварэнне лічбавых тапаграфічных і спецыяльных карт, карт аператыўнай абстаноўкі, 3D-мадэляў мясцовасці, апрацоўка даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Усяму гэтаму і навучаюць на ваенным факультэце БДУ.

«Нягледзячы на жорсткі адбор пры паступленні, насычаную і складаную праграму навучання, высокія патрабаванні да фізічнай падрыхтоўкі, на гэтую спецыяльнасць мараць паступіць многія хлопцы з усёй Беларусі, — уводзіць у курс справы **выкладчык цыкла ваенна-спецыяльных дысцыплін агульнавайсковай кафедры падпалкоўнік Міхаіл КРЫЧАЎЦОЎ.** — Курсанты ваеннага факультэта ў БДУ праходзяць навучанне як непасрэдна на самім ваенным факультэце, так і на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ, што стварае ўмовы для фарміравання ўсебакова развітых і добра падрыхтаваных спецыялістаў. У нас на факультэце ёсць спецыяльна абсталяваныя класы з тэхнікай, якія адпавядаюць патрабаванням сучаснай адукацыі. Выкладчыкі рэгулярна распрацоўваюць новыя вучэбна-метадычныя дапаможнікі, электронныя праграмы і віртуальныя трэнажоры для курсантаў, якія істотна дапамагаюць зразумець усю шматграннасць спецыяльнасці ГІС».

Дарэчы, шэраг выкладчыкаў — нядаўнія выпускнікі ваеннага факультэта. Сярод іх — і падпалкоўнік Міхаіл Крычаўцоў, які скончыў навучанне ў 2012 годзе па спецыяльнасці «Геаінфармацыйныя сістэмы ваеннага прызначэння». Вопыт, напрацаваны ў войсках, ён паспяхова ўкараняе ў навучальны працэс, з'яўляецца куратарам спецыяльнасці ГІС. Цяпер афіцэр актыўна займаецца навуковай дзейнасцю — праходзіць навучанне ў аспірантуры БДУ.

Курсанты спецыяльнасці ГІС выконваюць апрацоўку матэрыялаў аэрафотаздымкі мясцовасці, асвойваюць працэс вырабу артафотапланаў і іншых фотадакументаў мясцовасці. А з 2025 года ўсе курсанты ваеннага факультэта БДУ будуць праходзіць навучанне па праграме падрыхтоўкі аператараў FPV-дронаў.

«Для гэтага ўнесены змены ў навучальныя планы і праграмы навучання курсантаў, — тлумачыць Міхаіл Крычаўцоў. — Рыхтуецца да прыёму першых навучэнцаў клас падрыхтоўкі аператараў БПЛА, ствараецца адпаведная вучэбна-матэрыяльная база, якая ўключае трэнажорныя комплексы і наглядныя матэрыялы. Пасля навучання нашы выпускнікі паспяхова працягваюць службу ў навігацыйна-тапаграфічных частках па ўсёй тэрыторыі Беларусі, у складзе аператыўных камандаванняў, а таксама на пасадах начальнікаў навігацыйна-тапаграфічных службаў».

**Алег НЯКАЛА,**
**фота аўтара.**

# МІНСКІЯ СУВОРАЎЦЫ ЗАПРАШАЮЦЬ...

## У Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы адбыўся Дзень адкрытых дзвярэй







У прасторнай актавай зале вучылішча сабраліся мамы, таты, дзядулі, бабулі разам з дзецьмі і ўнукамі.

Начальнік установы адукацыі палкоўнік Дзмітрый Кучук азнаёміў прысутных з гісторыяй і сённяшнімі буднямі МСВУ.

Суворaўцы падрыхтавалі разнапланавую канцэртную праграму, у якой знайшлося месца выступленню барабаншчыкаў, інсцэніроўцы па рамане Юрыя Бондарава «Гарачы снег», сольным нумарам і песням вакальна-інструментальнага ансамбля «Пунсовыя пагоны».

Потым госці змаглі на свае вочы пазнаёміцца з умовамі жыцця і побыту суворaўцаў, элементамі абноўленай вучэбна-матэрыяльнай базы, атрымаць кансультацыі па паступленні ў 2025 годзе.

**Віктар ІВАНЧЫКАЎ.**

# КАЛІ ДЫЯГНАЗ — НЕ ПРЫСУД

## ДЫЯГНАСТУЮЦЬ ТОЕ, ШТО РАНЕЙ НЕ ВЫЯЎЛЯЛІ

Захваральнасць на рак расце як у Беларусі, так і ва ўсім свеце. Гэта звязваюць са старэннем насельніцтва.

— Людзі сталі жыць даўжэй, і, кажучы простай мовай, многія дажываюць да свайго раку — да выяўлення той ці іншай злаякаснай пухліны, якія з узростам сустракаюцца часцей. Таму колькасць такіх пацыентаў штогод павялічваецца, — расказвае **дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргей ПАЛЯКОЎ.**

Акрамя таго, спосабы выяўлення становяцца ўсё больш дасканалымі і дазваляюць дыягнаставаць тыя формы раку, якія раней не выяўляліся.

— Таму факт, што колькасць злаякасных новаўтварэнняў ва ўсім свеце, у тым ліку і ў Беларусі, павялічваецца, сведчыць: ахова здароўя працуе ў правільным кірунку. І пры выяўленні на ранніх стадыях мы можам пазбавіць чалавека ад гэтай хваробы, — адзначае кіраўнік РНПЦ.

Разам з тым смяротнасць ад злаякасных утварэнняў не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце знаходзіцца на другім месцы пасля сардэчна-сасудзістых захворванняў. Паводле слоў Сяргея Палякова, яе паступова ўдаецца стрымліваць і крыху зніжаць.

Пры гэтым яшчэ адной ацэнкай эфектыўнасці новых метадаў лячэння і работы стацыянараў можна лічыць паказчык пяцігадовай выжывальнасці — міжнародны крытэрый, што паказвае, якая частка пацыентаў перажывае пяцігадовую мяжу з моманту пастаноўкі дыягназу і лячэння. У Беларусі яго дасягаюць каля 60 % пацыентаў. Яшчэ адзін крытэрый, на які арыентуюцца анколагі, — пяцігадовая выжывальнасць пацыентаў, якія атрымалі лячэнне па радыкальных праграмах. Яе дасягаюць амаль 84 % радыкальна пралечаных пацыентаў, у тым ліку і пацыенты з апошняй, 4-й, стадыяй.

— Таму анкалогія — гэта не прысуд, а магчымасць прымянення новых метадаў лячэння — хірургіі, хіміятэрапіі, прамянёвай тэрапіі ці іх спалучэння, імунатэрапіі. І спосаб атрымаць добры вынік, да чаго мы і імкнёмся, — падкрэсліў Сяргей Палякоў.

## ЯК НЕ ПРАПУСЦІЦЬ ПЕРШЫЯ ПРЫКМЕТЫ?

Каля 60 тысячам беларусаў летась упершыню быў пастаўлены анкалагічны дыягназ. Па распаўсюджанасці ў жанчын на першым месцы па-ранейшаму рак малочнай залозы, у мужчын — рак прастаты. Апошні часта выяўляецца на ранняй стадыі дзякуючы аналізу на ПСА. А такое захворванне добра лечыцца ці ўвогуле не патрабуе лячэння, а толькі назіраецца анколагам. Калі ўзяць мужчын і жанчын сумарна, то лідзіруе каларэктальны рак. Што датычыцца выяўлення ранніх форм, то гэтаму спрыяе каланаскапія, таму яе рэкамендуецца праходзіць усім пасля 50 гадоў.

Найбольшыя поспехі айчыннымі анколагамі дасягнуты ў лячэнні раку мачавога пузыра — па яго выніках Беларусь знаходзіцца на трэцім месцы ў свеце. Нядрэнныя вынікі дасягнуты ў лячэнні ырачнаклетачнага раку — дзякуючы УГД нярэдка выяўляюцца маленькія пухліны на ранніх стадыях, што дазваляе вылечыцца з добрым прагнозам. Па выніках лячэння іншых відаў анказахворванняў наша краіна мае сярэднееўрапейскія паказчыкі.

Пры гэтым, як адзначыў Сяргей Палякоў, насцярожвае праблема запушчанасці раку поласці рота і глоткі. Каля 50 % гэтых пацыентаў прыходзяць да анколагаў на апошніх стадыях, прытым што гэта вонкавая лакалізацыя і для яе выяўлення на раннім этапе дастаткова агледзець поласць рота пацыента. Аднак паступова сітуацыя паляпшаецца — спецыялісты РНПЦ сустракаюцца з урачамі пярвічнага звяна — отарыналарынголагамі, стаматолагамі, урачамі агульнай практыкі.

Як жа не прапусціць першыя прыкметы злаякаснага працэсу ў арганізме? Як адзначае Сяргей Палякоў, у нашай краіне ўсе скрынінгі на самыя распаўсюджаныя лакалізацыі раку закладзены ў дыспансерызацыю. Калі праходзіць яе правільна, захворванне будзе выяўлена, за выключэннем каларэктальнага раку, бо магчымасць прайсці каланаскапію ёсць не ўсюды. Аднак пры жаданні на працягу некалькіх месяцаў і гэта абследаванне можна зрабіць.

— Заклікаю праходзіць дыспансерызацыю для ранняй дыягностыкі і лячэння злаякасных пухлін, — рэзюмаваў Сяргей Палякоў.

Нягледзячы на санкцыі, РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава супрацоўнічае з усімі краінамі. Медыкі ездзяць на канферэнцыі, кангрэсы, абменьваюцца вопытам. Вельмі цесныя навуковыя і практычныя сувязі з калегамі з Расіі. Напрыклад, беларускія пацыенты праходзяць лячэнне пратоннай тэрапіяй па праграме Саюзнай дзяржавы. Маладыя спецыялісты з Беларусі маюць магчымасць стажыравацца ў расійскіх анкацэнтрах — як па агульных праграмах, так і па персанальных дамоўленасцях.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)*

ЁСЦЬ ІДЭЯ!

# УЗДЗЕЯННЕ КОЛЕРАМ

**Бабруйчанін прыдумаў яшчэ адзін спосаб дапамагчы дзецям з абмежаванымі магчымасцямі**

Яшчэ некалькі гадоў таму Аляксандр ПУРЫМАЎ нават не думаў, што будзе спецыялістам па сенсорнай інтэграцыі. Ён рыхтаваўся стаць весляром. Вучыўся ў Бабруйскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву, узмоцнена трэніраваўся, быў прызёрам... Але аднойчы трапіў у бабруйскі Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, дзе папрацаваў з дзецьмі-інвалідамі. І гэта змяніла яго жыццё.



## ЭКСПЕРЫМЕНТ З ДОШКАЙ

Дзеці, з якімі працаваў, мелі дыягназ «аўтызм».

— Спецыяльнай адукацыі для работы з імі не патрабавалася, галоўнае — энтузіязм, — расказвае малады чалавек. — Пачаў займацца і зацікавіўся. Тады ўпершыню ўбачыў дошку Більгоу, магчымасці якой спачатку ацаніў скептычна. Распытваў, ад мяне адмахваліся, маўляў, мая задача — гуляць з дзецьмі. Праманіторыў інтэрнэт, нічога не знайшоў. І тады стаў рабіць свае назіранні. Гэта і прывяло да адкрыцця.

Дошка Більгоу — рэч для бацькоў асаблівых дзяцей вядомая. Лічыцца, што яна дапамагае сінхранізаваць работу цэнтраў мозгу, адказных за пазнавальныя і рухальныя функцыі, а таксама развіць каардынацыю.

Аляксандр заўважыў, што дзеці з цяжкімі захворваннямі не ахвотна кантактуюць з гэтым трэнажорам.

— Я дапамагаў ім ставіць ногі на балансір, падтрымліваў, але гэта было вельмі нязручна і для дзяцей, і для мяне, — расказвае суразмоўнік. — І тады я вырашыў прыкаваць увагу дзіцяці падсветкай. Гэта значна спрасціла работу. Дзіця адразу разумее, куды ставіць рукі, ногі, з чым узаемадзейнічаць.

Знаёмы праграміст дапамог Аляксандру зрабіць мабільны дадатак, каб кіраваць працэсам з тэлефона. Праграма ажывіла дошку, дзеці зацікавіліся. Малады вынаходнік зразумеў, наколькі палегчыў жыццё іх бацькам. І не спыніўся. Зрабіў дыягностыку, каб бацькі маглі самастойна падбіраць патрэбныя практыкаванні.

— Балансір — невычарпальная крыніца для развіцця, — з натхненнем кажа суразмоўнік. — На яго можна станавіцца рукамі, нагамі, адначасова і паасобку. Эксперыментаваць пры гэтым з вонкавым святлом. Падбіраючы варыянты, можна непрыкметна для дзіцяці навучыць яго рабіць тое, што раней зусім не атрымлівалася.

Акрамя ўдасканалення сенсорнага балансіра Аляксандр прыдумаў яшчэ так званыя сенсорныя пальчаткі з дробнымі шарыкамі ўнутры. Адной рукой узяць прадмет імі немагчыма, дзіця пачынае задзейнічаць другую. «А гэта развівае міжпаўшарныя сувязі мозгу, — тлумачыць вынаходнік. — Значыць, уключаецца кагнітыўнае мысленне і канцэнтрацыя, і маторыка. Усё накіравана на тое, каб пашырыць функцыянал дзіцяці. Яно прывыкае да таго, што не трэба «жаваць адчуванні» як жвачку, што кожны рух мае мэту і яе трэба дасягаць. Гэта прыводзіць да кантролю адчуванняў, настрою. І бацькам становіцца значна лягчэй.

## КАБ ІДЭЯ ПРАЦАВАЛА

Аляксандр падлічыў, што для рэалізацыі ідэі патрэбна не меней чым 25 тысяч долараў у эквіваленце. Дзе іх узяць? Вынаходнік заявіў сваю распрацоўку ў рэспубліканскі праект «100 ідэй для Беларусі». Знаходку ацанілі, але грошы перадалі іншаму даследчыку, больш удачліваму.

«Напэўна, час яшчэ не прыйшоў, але трэба пакласці пачатак», — аптымістычна вырашыў Аляксандр і паступіў у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка на кафедру лагапедыі. І пры першай магчымасці паказаў сенсорны балансір выкладчыкам. Яны таксама ацанілі, нават арганізавалі канферэнцыю, дзе дэталёва вывучылі эксперымент. Дзяўчынка, якая ў ім ўдзельнічала, вельмі дрэнна ўваходзіла ў кантакт. Звычайны балансір яна не ўспрымала. А вось сенсорны разняволіў яе, яна пагадзілася на яго ўстаць.

Студэнта натхніла гэта на ўдзел яшчэ ў адным анлайн-конкурсе ад БРСМ — інавацыйных ідэй. І зноў — высокая ацэнка, але не перамога. І зноў Аляксандр не апусціў рукі.

Яго асабісты кабінет у Бабруйску стаў месцам прыцягнення тых, каму патрэбна дапамога ў сацыялізацыі дзяцей. Практыка дае магчымасць карэкціраваць і развіваць вынаходніцтва.

— Пачатак пакладзены, цяпер працую над методыкай, — расказвае суразмоўнік. — Балансір — гэта платформа, у мяне шмат ідэй, як ён можа функцыянаваць. Зрабіў некалькі накладак, мадыфікацый. Ідэя прыгожая, але яна павінна набыць вагу. І, магчыма, для гэтага спатрэбіцца не адзін год. Але мэта таго вартая. Хочацца асаблівых дзяцей зрабіць больш самастойнымі. Балансір — гэта першы крок. Сёння існуе такое паняцце, як дапоўненая рэальнасць. Калі навучыць дзяцей рэагаваць на пэўныя колеры, ісці па лініі, якая свеціцца, іх можна зрабіць больш самастойнымі ў быце. Нават калі дзіця пойдзе на кухню і само нальне сабе вады, гэта поспех. Для бацькоў — вялікая палёгка. Гэта і ёсць мая мэта. Яна дасягальная.

Аляксандр Пурымаў лічыць, што Беларусь — менавіта тая краіна, дзе яго ідэя можа быць рэалізавана.

— Па-першае, у нас развіваецца інклюзіўная адукацыя. Па-другое, у нас ёсць усё для таго, каб прасоўваць перадавыя ідэі. Я зацікаўлены ўкараняць вынаходніцтвы ў сваёй краіне з прыцэлам на замежжа. Хачу, каб мая ідэя набыла сусветны маштаб. Каб яна мела беларускае паходжанне і ёй маглі карыстацца ўсе.

## РАБОТА НА ВЫНІК

Кабінет Аляксандра нагадвае гульнявы пакой, у якім па палічках раскладзены... Аляксандр строга папраўляе: не цацкі, а гульнявыя дапаможнікі. Кубікі, конусы, кольцы дапамагаюць удасканаліць рухі дзяцей і накіраваць іх у патрэбнае рэчышча. На набыццё гэтых дапаможнікаў і адкрыццё кабінета пайшло некалькі тысяч рублёў.

У некаторых наведвальнікаў гэтага кабінета паталогіі досыць цяжкія: пацыенты не могуць самі сябе абслугоўваць. Таму толькі спецыяліста па сенсорнай інтэграцыі недастаткова. Патрэбны яшчэ лагапед, псіхолаг, каб дзіця навучылася адчуваць свет і сваё месца ў ім, каб яго мозг і цела не жылі асобна адзін ад аднаго.

Аляксандр лічыць, што спецыялісту ў сферы, якую ён выбраў, трэба эксперыментаваць з методыкамі, бо дзеці розныя і да кожнага неабходна знайсці падыход. Карысным гэта распрацоўка стане і для бацькоў.

— У іх будзе асабісты візуальны памочнік, і яны змогуць абысціся без мяне, — спадзяецца Аляксандр. — У рамках мабільнага дадатку хачу стварыць суполку, каб бацькі асаблівых дзяцей адчувалі сябе камфортна і маглі быць на сувязі. Гэта павысіць матывацыю. Маўляў, калі ў аднаго нешта атрымалася, значыць, атрымаецца і ў другога.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*г. Бабруйск.*

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие **«Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **ОАО «БВО»** (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

**холодильника, инв. № 643/С-16170, общей площадью 858,5 кв. м и холодильника, инв. № 643/С-16171, общей площадью 561,2 кв. м, расположенных на земельном участке площадью 1,9452 га с кадастровым номером 623480800001000041 (право аренды по 14.03.2074) по адресу: Минская область, Любанский район, Коммунаровский с/с, 3, 950 м северо-западнее д. Кузьмичи.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,0326 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 16 275,17 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 627,00 бел. руб.**). **Стоимость снижена на 65 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию в СМИ. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 29.10.2024.

Аукцион состоится **18.02.2025 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.02.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.
**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136- 31-11.**
**Тел. для осмотра: (801794) 63-600, (8029) 643-90-18.**

УНН 600020681



**Брестский областной исполнительный комитет**

уведомляет о том, что конкурс на выполнение государственного социального заказа в области проведения профилактических мероприятий по предупреждению распространения вируса иммунодефицита человека по результатам проведения заседания конкурсной комиссии 31.01.2025 г. признан несостоявшимся.

УНП 291638092



Брестский филиал
РУП "Институт недвижимости и оценки"
извещает о проведении открытого аукциона

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот №1:** грузовой седельный тягач MAZ 5440 A5-370-030, год выпуска — 2013 г., регистрационный знак АН 5412-1 | 28 320,00 | 1 416,00 |
| **Лот №2:** грузовой бортовой тентовый GAZ-33023, год выпуска — 2006 г., регистрационный знак АЕ 6212-1 | 15 600,00 | 780,00 |
| **Лот №3:** грузопассажирский вагон (WAGON) UAZ 3909 92, год выпуска — 2001 г., регистрационный знак АМ 0085-1 | 4 680,00 | 234,00 |

**Местонахождение объектов:** г. Брест, ул. Я. Купалы, 108K. **Продавец:** ОАО «Стройгаз, г. Брест», 224032, г. Брест, ул. Я. Купалы, 108K, тел./факс 80162340476. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки", г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты заключения договора. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее, чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона.

**Аукцион состоится 11 марта 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений — 10 марта 2025 г. до 17.00**



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ООО «КорпКонсалт-Инвест»** (Продавец) на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 10.03.2025 в 10.00.**

Лот № 1 в составе: 1. Административное помещение с инв. № 500/D-685413, 1996 г. п., общая площадь 669,5 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Михася Лынькова,19/2-7.
2. Административное помещение с инв. № 500/D-685426, 1996 г. п., общая площадь 291,8 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Михася Лынькова,19/2-14. Обременения: аренда. Земельный участок 500000000006000530, площадью 0.5894 га. Начальная цена – 1 400 000,00 руб. без учета НДС. Задаток – 140 000,00 руб.
Шаг аукциона – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 05.03.2025 в 16.00.

Организатор электронных торгов:
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by


ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА

# АГРАРЫІ РЫХТУЮЦЦА ДА РАННЯЙ ВЯСНЫ

Правесці веснавую палявую кампанію ў аптымальныя тэхналагічныя тэрміны — цяпер галоўная задача для аграрыяў. У самым паўднёвым і цёплым рэгіёне краіны — на Гомельшчыне, гаварыць аб пасяўной пачалі ўжо ў студзені.

Асаблівая ўвага аддаецца гатоўнасці сельскагаспадарчай тэхнікі. Стан машынна-трактарнага парка і пасяўных агрэгатаў, як і ўсе пытанні ў аграсферы, — на асаблівым кантролі **старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана КРУПКО** і **памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гомельскай вобласці Юрыя ГОРЛАВА**.



На пачатак лютага ў Гомельскай вобласці сельгастэхніка да выхаду ў палі гатова на 85 %, што ў сярэднім на 7 % вышэй у параўнанні з мінулым годам, а па некаторых пазіцыях — на 15 %. З пачатку года ў строй уведзена больш як 1400 адзінак прычапной глебаапрацоўчай і пасяўной тэхнікі. Для своечасовага выканання рамонтных работ і падрыхтоўкі тэхнікі па пасяўной кампаніі складзены штотыднёвы план.

— Першачарговая задача — паставіць на лінейку гатоўнасці не менш як 95 % сельскагаспадарчай тэхнікі, задзейнічанай на вясенне-палявых работах: плугі, культыватары, машыны для ўнясення мінеральных угнаенняў, сеялкі, пагрузчыкі — словам, усю тэхніку, якая першым эшалонам адпраўляецца ў поле, — падкрэсліў **першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый ПЕТРАЖЫЦКІ** на нарадзе ў аблвыканкаме і абласным семінары па пытаннях сельскай гаспадаркі. — Пастановай Савета Міністраў агульная падрыхтоўка тэхнікі прадугледжана да 25 сакавіка, але з улікам цёплых умоў надвор'я ўрадам і Прэзідэнтам дадзена даручэнне паскорыць тэмпы і завяршыць да 1 сакавіка.

Рамонтныя прадпрыемствы Гомельшчыны наладзілі аднаўленне ў тым ліку складанай тэхнікі, вузлоў і агрэгатаў, арганізаваны і выязныя рамонты.

Удзельнікі абласнога семінара па пытаннях сельскай гаспадаркі, якія прайшоў на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна, вывучылі вопыт навядзення парадку на зямлі сельгаспрадпрыемстваў «Крыўск», «Губічы», «Буда-Кашалёва-аграсэрвіс». Былі прадэманстраваны таксама спосабы раскарчоўкі старых садоў, у тым ліку з мінімальнымі затратамі. Да пачатку пасяўной перад аграрыямі ўсіх раёнаў вобласці пастаўлена задача закладкі новых плантацый садавіны. На тэрыторыі Гомельшчыны рэалізуецца пяцігадовы план садаводства.

— Пастаўлена сур'ёзная задача: закласці сады, якія праз тры-чатыры гады пачнуць прыносіць ураджай, і мы зможам у дастатковым аб'ёме запоўніць паліцы крам айчыннымі яблыкамі, — адзначыла **начальнік упраўлення інтэнсіфікацыі раслінаводства камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Алена ФІЛІПОВІЧ**. — Перавага будзе аддавацца саджанцам беларускіх сартоў. Акрамя яблынь, прадугледжаны таксама высакарослыя кусты: буякі, парэчкі, чарнаплодная рабіна, маліна і іншыя.

Прадстаўнік аблвыканкама зазначыла, што ў развіцці садаводства ў рэгіёне заахвочваюцца не толькі сельгасарганізацыі, але і фермерскія гаспадаркі.

— Важна, каб і яны былі зацікаўлены. Ім выдзяляюцца высакабальныя зямельныя ўчасткі. Гэта добрыя землі, дзе можна закладваць сур'ёзную эканоміку, ствараючы новыя пакаленні садоў з кропельным палівам, — лічыць Алена Філіповіч.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**



Канцэрн «Беллегпрам» стварае новую экіпіроўку для каманды «МАЗ-СПОРТаўта». Куратарамі праекта выступаюць вядомыя беларускія дызайнеры — галоўны мастак-мадэльер Дызайн-цэнтра ААТ «Камволь» Эльвіра ЖВІКАВА і мадэльер-дызайнер брэнда LEMONGRASS Алена БРЫЦЬКА.

— Мы ўжо графічна адмалявалі калекцыю, распрацаваўшы канцэпцыю на базе мадэляў прадпрыемстваў канцэрна, — расказала Эльвіра Жвікава. — Асартымент досыць варыятыўны: прадстаўнікам каманды мы будзем прапанаваць на разгляд цэлы шэраг мадэляў.

СТАЛА ВЯДОМА

# ФОРМА Беларускія

Будуць выбраныя тыя варыянты, якія сапраўды спадабаюцца спартсменам. Тэрміны сціслыя, і эскізная частка ўжо зацверджаная на пасяджэнні ў канцэрне «Беллегпрам». Цяпер эскізы рассылаюцца па прадпрыемствах, мы прагаворваем усе дэталі з дызайнерамі і тэхнолагамі ўжо непасрэдна на вытворчасцях.

Новая экіпіроўка будзе адшывацца на прадпрыемствах «Беллегпрам». У праекце ўдзельнічаюць практычна ўсе найбуйнейшыя брэнды канцэрна, у тым ліку «Славянка», «Палессе», «Світанак», ААТ «8 Марта» і г. д. «Магатэкс» і «Камволь» прадастаўляюць тканіны. Прапануюць свае варыянты абутку «BELWEST», «Луч», «Marko», «АКТИВ ШУЗ». Не застанецца ўбаку «GALANTEYA» — яна распрацоўвае мадэлі сумак і несэсэраў для гоншчыкаў.

# ДЗЕЛЯ ІНТЭГРАЦЫІ Ў РЭГІЁНЕ

## Праекты ЕАБР прэзентавалі на Digital Almaty 2025

**У рамках міжнароднага лічбавага форуму Digital Almaty 2025, які прайшоў 31 студзеня — 1 лютага ў Алматы, намеснік старшыні праўлення Еўразійскага банка развіцця (ЕАБР) Тыгран Саркісян прадставіў перадавыя лічбавыя праекты фонду лічбавых ініцыятыў банка.**




У прыватнасці, ён прадставіў чатыры ключавыя праекты (усяго ў пуле фонду 10 праектаў), накіраваныя на развіццё лічбавай эканомікі і інтэграцыі ў рэгіёне, паведамілі ў прэс-службе ЕАБР. Што гэта за праекты?

1. Нацыянальная лічбавая інвестыцыйная платформа. Яна забяспечвае эфектыўнае ўзаемадзеянне паміж інвестарамі і дзяржаўнымі органамі, прапаноўваючы «зялёны калідор» для прыярытэтных праектаў, маніторынг у рэальным часе і магчымасць маштабавання на краіны ЕАЭС. Цяпер загружана больш за 800 інвестыцыйных праектаў з патэнцыялам стварэння 150 тысяч працоўных месцаў.

2. «Работа ў ЕАЭС». Гэта лічбавая платформа для аптымізацыі працоўнай міграцыі і кадравай мабільнасці. У дадатку даступны 149 лічбавых сэрвісаў, якія ахопліваюць 7 краін-удзельніц, гэта краіны ЕАЭС, а таксама Таджыкістан і Узбекістан. Дадатак падтрымлівае рэгістрацыю для грамадзян з 16 краін, што дае магчымасць больш як двум мільярдам грамадзян атрымаць доступ да больш чым 691 тысячы вакансій і спрыяе развіццю ключавых галін эканомікі.

3. GovStack — лічбавая трансфармацыя дзяржкіравання. Гэта міжнародная ініцыятыва па развіцці электроннага ўрада ў краінах Цэнтральнай Азіі і Каўказа. GovStack будзе ўяўляць сабой партал (вэб-сайт), які змяшчае праекты і іх тэхнічнае апісанне. Мэта апублікаваных праектаў — імплементацыя ў іншых краінах у якасці гатовых прадуктаў, заснаваных на рашэннях Open Source. Кожная краіна — удзельнік праекта будзе мець магчымасць падзяліцца найлепшай практыкай са свайго партфолія для развіцця лічбавізацыі рэгіёна. Рэалізацыя разлічана на два гады.

4. BEE-ONLINE.ru — гэта экасістэма лёгкай прамысловасці. Платформа кааперацыі ўдзельнікаў індустрыі лёгкай прамысловасці ў ЕАЭС і за яго межамі. Праект сабраў галіновыя асацыяцыі Расіі, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кіргізіі, Узбекістана. Карта выкарыстання платформы пастаянна пашыраецца, экасістэма выйшла за межы ЕАЭС. Ёю карыстаюцца ва Узбекістане, Таджыкістане, Турцыі, Індыі, Кітаі, Італіі, Шры-Ланцы, Бангладэш, Тунісе, В'етнаме, Сербіі, Егіпце, Пакістане, Марока, Манголіі. У BEE-ONLINE ужо ўвайшлі больш за 4600 фабрык, а да 2030 года чакаецца больш за 100 тысяч удзельнікаў.

— Фонд лічбавых ініцыятыў ЕАБР актыўна працуе над развіццём лічбавай інтэграцыі ў рэгіёне. Нашы праекты накіраваны на павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці, спрашчэнне працоўнай міграцыі, лічбавізацыю дзяржкіравання і падтрымку прамысловых экасістэм. Digital Almaty 2025 — ідэальная пляцоўка для прадстаўлення перадавых рашэнняў і пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва, — адзначыў Тыгран Саркісян.

# ПРЭМ'ЕРА ГОДА: ІНАПРАМ ЕДЗЕ Ў БЕЛАРУСЬ!

**Як расказалі ў Міністэрстве прамысловасці, нас чакае важная падзея — першая міжнародная прамысловая выстава «ІНАПРАМ. Беларусь».**




Адзначым, што наша краіна — даўні і надзейны сябар ІНАПРАМ, краіна-партнёр выставы ў 2023 годзе.

Як патлумачылі арганізатары, «ІНАПРАМ. Беларусь» — гэта міжнародная прамысловая выстава, якая аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных галін прамысловасці, інавацыйных кампаній, інвестараў і дзяржаўных структур. Гэта ўнікальная платформа для абмену вопытам, укаранення новых ідэй і тэхналогій, што спрыяе павышэнню актуальнасці галіны і развіццю супрацоўніцтва паміж краінамі.

Плануецца, што яна пройдзе 29 верасня — 1 кастрычніка 2025 года ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры.

# ДЛЯ НОВЫХ ПЕРАМОГ

## дызайнеры пераапрануць гоншчыкаў







Узоры экіпіроўкі каманды «МАЗ-СПОРТаўта» будуць гатовыя ўжо да канца лютага, дадала галоўны мастак-мадэльер Дызайн-цэнтра ААТ «Камволь».

Нагадаем, што 21 студзеня кіраўнік дзяржавы наведаў Мінскі аўтазавод, у тым ліку тэрыторыю спартыўнай каманды «МАЗ-СПОРТаўта». Прафесійная гоначная каманда Мінскага аўтамабільнага завода, якая ўдзельнічае ў ралі-рэйдах, была створана ў 2010 годзе і з'яўляецца структурным падраздзяленнем ААТ «МАЗ». За час існавання яна ўзяла ўдзел у 54 гонках нацыянальнага і міжнароднага ўзроўню, у 34 з якіх стала прызёрам або пераможцам.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

**ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»**

извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 21 марта 2025 г. годового общего собрания по адресу: г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах работы Общества в 2024 году и основных направлениях развития на 2025 год.
2. Отчет наблюдательного совета и ревизионной комиссии о работе в 2024 году.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2024 год. О дивидендах за 2024 год.
4. О направлениях использования прибыли Общества в 2025 году.
5. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
6. Выборы членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

**Место проведения собрания по месту нахождения ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»: г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35.**

**Начало работы собрания в 11.00.**

Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 в день проведения собрания. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 1 марта 2025 года.

Орган, созывающий собрание: наблюдательный совет Общества, основание созыва: протокол от 30.01.2025 № 2/2025.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 20.02.2025 года, по месту нахождения Общества.

Наблюдательный совет ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ».

УНП 100036332

21 марта 2025 г. в 13.00
состоится годовое общее собрание акционеров
ОАО «Лунинецлес».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2024 год и основных направлениях деятельности общества в 2025 году.
2. Отчет совета директоров общества за 2024 год.
3. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2024 год.
4. Об утверждении распределения прибыли общества по итогам работы за 2023 год, о выплате дивидендов за 2024 год.
5. Об утверждении основных направлений использования прибыли в 2025 году и первом квартале 2026 года.
6. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизора общества.
7. Об избрании членов совета директоров и ревизора общества.

Место нахождения ОАО «Лунинецлес»: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Место проведения собрания: г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Время регистрации в день проведения собрания с 12.30 до 13.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра акционеров 01.02.2025 года.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 28.02.2025 года (с 14.30 до 15.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200251040

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00041** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витрайбыт», Витебский р-н, аг. Шапечино, ул. Молодежная, д. 3, каб. 1, тел. 80212 262401

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 07.03.2025 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-79674, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – комплексный приемный пункт, площадью 46,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебский район, аг. Вороны, ул. Ленинская, 36А.

Обременения: договоры аренды: № 11 с 01.03.2019 по 28.02.2025, № 184 с 05.04.2024 по 04.04.2025, № 216 с 01.10.2024 по 30.09.2025.

**Нач. цена: 31 800,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 3180,00 бел.руб.**

Объект расположен на земельном участке с кадастровым № 221281201101000281, площадью 0,00146 га (право постоянного пользования).

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с законодательством.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 06.03.2025. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан: в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 (десяти) календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи.

Расходы Продавца на проведение независимой оценки составляют 507,38 белорусских рублей с учетом НДС.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: «Недвижимое имущество». Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Сокол Яна Олеговна, +375333169003.

ВЕРНІСАЖ

# КАЛЯРОВЫЯ ІМГНЕННІ ВЕЧНАСЦІ

## Адкрылася выстаўка карцін Міколы Кірэева





Часам мову жывапісу Міколы Кірэева параўноўваюць з музыкай. І сапраўды, у тонкіх пералівах колераў яго палотнаў нібыта заўсёды чуецца мелодыя... Часам — лірычная, часам — драматычна-напружаная... Пачуць гэта маюць магчымасць усе, хто наведае мастацкую галерэю Міхаіла Савіцкага, дзе адкрылася выстава заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Міколы Кірэева «Імгненні прыгажосці».





У экспазіцыі прадстаўлены працы майстра, пачынаючы з 1980-х і да нашага часу. Такім чынам, можна прасачыць і пошукі мастака, які не баіцца эксперыментаваць, і яго вернасць самому сабе, тое, што робіць карціны пазнавальнымі. Нехта з мастацтвазнаўцаў заўважыў, што Мікола Кірэеў цягам гадоў стварае пэўныя цыклы карцін, хоць гэта і не пазначае ў назвах. Сапраўды, ёсць тэмы, якім ён застаецца верны. Адзін з такіх мімаволі ўтвораных цыклаў — жаночыя партрэты, у якіх — і абагульненне, калі ў канкрэтным аблічча выяўляецца ўніверсальная гармонія, і захапленне аўтара прыгажосцю сваёй мадэлі, і асаблівая далікатнасць, тонкасць выканання. Нездарма адзін з гэтага цыкла, партрэт жонкі і музы Алены, быў абраны для постара выставы.

Яшчэ адзін такі ўтвораны самім часам цыкл, яшчэ адна важная частка творчасці мастака — выказванне любові да рознай зямлі. І не проста занатаванне яе прыгажосці, але праз сімволіку і філасофію. Стрыманыя высакародныя колеры палатна, якое паказвае з птушынага палёту святкаванне Калядаў у Заслаўі, ператвараюць усё ў загадкавы, амаль планетарны рытуал. Карціна «Да Вушач» паказвае заснежаную лясную дарогу — бель шляху, цёмныя шэрагі ялін, светлы прагал паміж імі ўдалечыні... Трывога і надзея. Кожны па-свойму расшыфруе гэтае загадкавае палатно. Нават нацюрморты ў выкананні Кірэева ператвараюцца ў сімвалы з умоўнымі, цякучымі формамі, у музыку выразнай эмоцыі. Пры гэтым партрэты славутых беларусаў, якія таксама можна вылучыць у асобны цыкл, пры ўсёй сімвалічнасці захоўваюць пазнавальнасць і характарнасць персанажаў — ад Міколы Селешчука да Аксаны Волкавай.

Асаблівае адчуванне колеру мастаком адзначыла падчас адкрыцця выставы **намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ**:

— Мне здаецца, адштурхоўваючыся ад гэтай любові да колеру, Мікола Кірэеў увесь час ішоў па жыцці. У яго няма афіцыйных партрэтаў. Ён заўсёды маляваў тых, каго хацеў, хто яму падабаўся і яго кранаў, з кім ён сябраваў і каго мог адчуць. Можа быць, менавіта таму з такім задавальненнем глядзіш на яго жаночыя партрэты. Кожны з іх — гэта абсалютная індывідуальнасць.

Для самога ж Міколы Кірэева выстава стала магчымасцю па-новаму зірнуць на ўласныя працы і вызначыць шлях далейшых пошукаў:

— Хацелася ведаць, у якім перыядзе мыслення і адчування я знаходжуся, і зрабіць нейкую карэкцыю, — прызнаўся аўтар.

У экспазіцыі прадстаўленыя працы з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, Беларускага саюза мастакоў, асабістага збору аўтара.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ПАДАРОЖЖА ДА «ПЛАНЕТЫ «ЦЫРК»

Новую праграму «Планета «Цырк» у суботу прэзентавалі ў Белдзяржцырку. Фотакарэспандэнт «Звязды» за дзень да гэтага трапіла на генеральную рэпетыцыю і дзеліцца яркімі кадрамі з гэтага цудоўнага шоу.







Лізавета ГОЛАД.







— Чаму назва «Планета «Цырк»? Таму што гэта разнастайнасць жанраў. Ва ўсім гэтым будуць задзейнічаны тры складнікі: добрая трукавая частка, добрая дрэсура і, вядома, добрая клоўнская работа, — адзначыў **дырэктар Белдзяржцырка Уладзімір ШАБАН**.

Па яго словах, кожную праграму тут робяць індывідуальна і эксклюзіўна, каб не было прахадных нумароў.

А **мастацкі кіраўнік Белдзяржцырка Вітаўтас ГРЫГАЛЮНАС** адзначыў, што асаблівасць гэтай «планеты» ў тым, што на ёй пануюць толькі станоўчыя эмоцыі: узаемаразуменне, імкненне здзіўляць і радаваць.

— Гэтая планета зусім невялікая: у дыяметры ўсяго 13 метраў: такі ў нас памер манежа. Тым не менш на гэтай невялікай планеце змяшчаецца такое дзіўнае спалучэнне жанраў, нумароў і трукаў, — падзяліўся ён.

Шмат цікавых відовішчных нумароў падрыхтавалі ў Белдзяржцырку для гледачоў. Гэта і пластычныя акрабаткі, і спрытны жанглёр, і абаяльныя сабачкі, і смелыя канатаходцы. Аднак самым эксклюзіўным нумарам стала «Кола смеласці» Андрэя Пагарэлава. Ён адзіны ў свеце чалавек, які выконвае сальта з піруэтам на семафоры.

Наведаць новую цыркавую праграму можна да 11 мая.

НАДВОР'Е

# У ЛЮТЫМ ПРЫЙШЛА ЗІМА

## На тыдні падмарозіць да мінус 14

Па апошніх даных, сярэднясутачны паказчык па краіне складае ад мінус 1 да плюс 1, што на 3—6 градусаў вышэй за шматгадовыя значэнні. На гэтым тыдні паніжэнне тэмпературнага фону працягнецца, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А ў аўторак воблачна з праясненнямі. У многіх раёнах краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы мінус 1 — 7 °C, а максімальная днём ад мінус 3 да плюс 2 °C.

У сераду па краіне пройдзе невялікі кароткачасовы снег, мокры снег. Раніцай і днём месцамі па захадзе Беларусі чакаецца слабы галалёд. Вецер няўстойлівы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да мінус 10 °C, пры праясненнях паветра будзе астуджацца да мінус 13 °C. Холадна будзе і днём — ад нуля да мінус 6 °C, а па захадзе краіны да плюс 2 °C.

І ў чацвер месцамі па краіне пройдзе невялікі кароткачасовы снег і мокры снег. Тэмпература паветра ўначы мінус 3 — 10 °C, пры праясненнях да мінус 13 °C. Максімальная тэмпература днём будзе ад мінус 5 да плюс 2 °C.

З 7 да 9 лютага будзе пераважна без ападкаў. У пятніцу ўначы чакаецца ад 3 да 8 марозу, пры праясненнях да мінус 11 °C. У дзённыя гадзіны тэмпература будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 2 °C.

Практычна не зменіцца тэмпература ў суботу, калі ўначы чакаецца мінус 2 — 8 °C, пры праясненнях магчыма паніжэнне да 11 марозу і ад мінус 4 да плюс 2 °C днём.

У нядзелю ўначы слупок тэрмометра апусціцца ад мінус 4 да мінус 10 °C, пры праясненнях магчымы маразы да мінус 14 °C. Удзень тэмпература будзе вар'іравацца ад мінус 4 да плюс 2 °C.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «ШТО НІ ВОСЕНЬ

## гэткі знак нам дарэчы... Яшчэ і як!..»



Жыццё — нібы той анекдот. Леташнім летам адзін мужчынка ў вёску паехаў: дровы нарыхтоўваў, дах перакрываў, студню чысціў, сена касіў... Адпачываў, карацей, і па поўнай праграме: калі двойчы, калі тройчы на дзень на рэчку хадзіў. Спачатку ў плаўках купаўся, потым — асмялеў: усё роўна ж нікога няма? На бераг неяк вылез, галаву ўгору задраў, стаіць, абсыхае... Аж чуе — шоргат нейкі... Аж бачыць — прыгажуня ідзе: напрасткі, да яго і такая... Сэрца зайшлося!

Порткі надзець ён ніяк не паспяваў. Але ж побач каструля валялася. Ён за ручку яе і, глядзіш, прыкрыўся... Маладзіца тым часам ужо блізка зусім, усміхаецца на ўсе 32: «А давайце адгадаю, аб чым вы думаеце?» — «Ну, паспрабуйце», — хмыкае герой. — «Вы думаеце, што ў гэтай каструлі ёсць дно».

Аб чым, паглядзеўшы на чарговы конкурсны здымак (можна яшчэ раз зірнуць на верхні), падумалі ўдзельнікі конкурсу на найлепшы подпіс да здымка? Чытаем: з ліста **мінчаніна Янкава**:

*Фотаздымачак давёў*
*Мне, табе і ўсім жа чыста,*
*Што ў рубрыку прыйшоў*
*Назіральны Феакцістаў!*

І сапраўды, у газеце не першы год друкуюцца яго здымкі, а зрэдку — яшчэ і загадкі.

«Гляну на чарговую, — піша **Мікалай Старых з Гомеля**, — і адразу ўспомню, як аднойчы па «зебры», да таго ж перад аўтобусам, які ўжо спыніўся, каб прапусціць людзей, першым пераходзіў вуліцу. І гэта шчасце, што ішоў памалу, бо каб трохі хутчэй... Перад самым носам па суседняй паласе пранеслася машына».

«Часам якраз вось так на роўным месцы адбываюцца розныя ДТЗ, — лічыць спадар Мікалай, — хоць нашы кіроўцы яшчэ малайцы, трымаюцца правілаў. Гэта пра каўказцаў шмат анекдотаў».

Адкуль, трэба разумець, радкі:

*Знак нам кажа: пешаход,*
*Тут бяспечны пераход.*
*Ды ўсё ж лепей з асцярогай*
*Нам трымацца на дарогах,*
*Хоць па «зебры», хоць пад знак*
*Азірацца па баках.*
*Мо ў той час паблізу недзе*
*Ці «джыгіт», ці дурань едзе.*

І гэта калісьці, нават напіўшыся, яны маглі ўскараскацца на воз, спакойна заснуць: дабрацца дадому. Конь давозіў (і, дзякаваць богу, давозіць — месцамі). Кіроўцы ж іншых відаў транспарту павінны пастаянна думаць пра пешаходаў, пешаходы — пра кіроўцаў, якія ў любы момант могуць выкінуць на дарозе невядома што. А ўсё чаму? На думку **сужэнцаў Астроўскіх**:

*Новы піск цяпер у модзе*
*Ў маладзейшых і бабуль —*
*Неспадзеўкі на дарозе*
*Аб'явіцца... З ніадкуль.*
*А кіроўцам што рабіць?*
*Тут падумаеш наўрад:*
*Нехта будзе тармазіць,*
*Хтось, крый бог, заедзе ў зад.*

З дыялогаў мужчын: «Кацю я збіў на матацыкле... Потым пазнаёміўся і ажаніўся». — «Шкада, што мы, кіроўцы, не ведаем пра ўсе наступствы аварый... Асцярожней ездзілі б».

Трэба разумець, больш уважліва глядзелі б на знакі і думалі (мо ўслед за **аршанцам Мікалаем Камароўскім**), што

*Не ў лазні ж ён прыліп*
*Да мужчынкі гэты ліст*
*На вірлівым пераходзе?..*
*Каб увагу засяродзіць!*

Зноў жа з дыялогаў (чарнаваты, але ж гумар): «Доктар, ад чаго памёр ваш пацыент?» — «Ад старасці». — «Але ж казалі, што ён трапіў пад машыну?» — «Так... А каб быў маладзейшы — адбег бы»... Альбо кіроўца (той, што наехаў) лепей бачыў бы знакі, сярод якіх, на думку **Любові Чыгрынавай з Мінска**, з'яўляюцца новыя:

*Ас-рэкламшчык Мішка*
*«Зкрэятывіў» фішку:*
*Ліст... І ўсё іначай:*
*Бо на знаку — мача!*

І гэта, паводле **мінчан Эльяша Банеля і сужэнцаў Астроўскіх**, добра:

*Знак патрэбны тут стаіць:*
*Бачаць людзі, дзе хадзіць,*
*А лісток прывесілі,*
*Каб яшчэ і весела.*
Адпаведна
*Знак не чыніць перашкоды*
*Ні аўто, ні пешаходам,*
*А хутчэй наадварот:*
*Бо ўсміхаецца народ!*

Так-то яно так, але ж у кожнага медаля два бакі: **Валерый Гаўрыш з Чавусаў** звярнуў увагу якраз на другі:

*Ёсць лісток?*
*Фанабэрыцца знак!*
*А даішнікі б'юць трывогу:*
*Бо кіроўцы тармозяць...*
*Аднак*
*Ну зусім не глядзяць на дарогу!*

З нагоды слушная рэпліка ад **спадара Камароўскага**:

*Апалы ліст — асенняя прыкмета...*
*На тое ж месца плаўкі трэба летам.*

Што, на думку **Раісы Ісакавай з Чавускага раёна**, цалкам лагічна:

*Зімка снегам асыпала,*
*Увесну сонца апякала...*
*Знак дарожны гэты*
*Ліўнем мыла лета.*
*Ды нарэшце лёсіла*
*На лісточак восенню.*
*Каб прыкрыў хоць сорам*
*Не калеў больш голым.*

«У суседстве са знакам расце клён, — выказвае здагадку **Валерый Гаўрыш**. — Але ж, думаю, адносіны ў іх зусім не найлепшыя». Адкуль высновы? Ды ён, падобна, размову пачуў:

*— Ганьба, ганьба вось гэтакім голым*
*Пры дарозе табе красавацца! —*
*Клён з малюнка пакпіў...*
*Сорам лістам прыкрыў*
*Ды падалей стараўся трымацца.*
*...Мусіць, грэх было кпіць:*
*Клён той голы стаіць:*
*Бумерангу ўласціва вяртацца.*

Шкада, што не робіць гэтага час... Вось гэтым трошкі сумным прызнаннем і завяршыць бы чарговы агляд, але ж трэба паведаміць, што найлепшыя радкі пра рыбака, які лавіў рыбу, седзячы ў... крэсле (гл. нумар «Звязды» за 4.12.2024 г. альбо сайт — «Калейдаскоп», «Хто каго?»), атрымаліся ў **спадарыні Соф'і Кусянковай**, а значыць, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на другі квартал 2025 года накіроўваецца на Рагачоўшчыну.

*Хочаце, каб родная газета на роднай мове пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас? Тады варыянтаў два: альбо своечасова афармляць падпіску, альбо ўважліва паглядзець на чарговы конкурсны здымак (унізе), прыдумаць подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных, каротких — не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанс на выйгрыш мае кожны. Паспехаў!*

**Валянціна ДОЎНАР.**




Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# Извещение о проведении повторных аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта/ Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Ограничения и условия в его использовании | Инженерное обеспечение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **переулок Боровой 2-й, 13,** и земельный участок | 140100000001023226 | 0,1024 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **136 556,01** (99 128,81 – не завешенный строительством незаконсервированный жилой дом, 37 427,20 – земельный участок) | 27 000,00 | **4 745,14** | 0,0001 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0011 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,1024 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях. | существует возможность подключения к системам газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения |

Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с Положением о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Брестского городского исполнительного комитета от 06.12.2021 г. № 1619.

**Размер штрафа** уплачиваемый в случаях, определенных Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 — **4 200,00 рублей**

**Организатор аукционных торгов —**
КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»
г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон 53 81 92.

**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 16.00 28.02.2025 г.**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

▶ в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

▶ часть оплаты за предмет аукциона (часть оплаты – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

▶ часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленная пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

▶ возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

▶ компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

▶ подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

▶ в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

▶ разработать, в установленном порядке, проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;

▶ представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;

▶ завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится 6 марта 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал. Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30. 04.02.2025 г. до 16.00. 28.02.2025 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб, вс) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.** Контактный телефон 53 81 92.

Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by

